ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Год выдання 38-ы
№ 82 (2442)
17 кастрычніка 1969 г
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

У КОСМАСЕ—ВАХТА МУЖНЫХ

КАРАБЕЛЬ «САЮЗ-6» ПАСПЯХОВА ЗАКОНЧЫЎ КАСМІЧНЫ РЭЙС

ЗДЗЕЙСНЕНАЯ МАРА

Вялікі рускі вучоны Канстанцін Эдуардавіч Цыялкоўскі гаварыў, што Зямля для чалавека з'яўляецца толькі калыскай, што будучыня належыць Сусвету.

Сёння розум чалавека практычна сягнуў у космас, у вялікую разведку Сусвету. Тое, што было марай, што здавалася казкай, стаецца явай.

Гэта стала магчыма дзякуючы таму, што ў выніку Кастрычніцкай рэвалюцыі на землях былой царскай Расіі запанаваў сацыялістычны лад, які раскаваў да рэвалюцыйнага дзеяння творчыя сілы працоўных. Упершыню ў нашай сацыялістычнай краіне ўзвіўся ў космас першы касмічны карабель з першым разведчыкам космасу Юрыем Гагарыным.

Цяпер курсуюць у падзорных вышынях караблі—«Саюзы». Розум чалавека ўсё глыбей і глыбей пранікае ў нязведаныя тайны Сусвету ў імя будучыні чалавецтва.

Слава савецкім героям космасу!

Пілін ПЕСТРАК.

ЧЫРВОНЫЯ ЗОРЫ

Сямёра смелых. Сямёра мужных, адважных сыноў нашай сацыялістычнай Радзімы на чырваназорных караблях выконваюць адказнейшае заданне.

З вялікай увагай сочаць за іх палётам савецкія людзі. Упершыню ў гісторыі чалавецтва на каляземнай арбіце адбываецца групавы палёт трох касмічных караблёў. Савецкія людзі планамерна вядуць штурм касмічнай прасторы.

Палёт трох «Саюзаў»—гэта яшчэ адзін трыумф нашай савецкай навукі.

Яшчэ адзін трыумф нашага савецкага характару.

Адна за адной адкрываюцца людзям таямніцы космасу, таямніцы сусвету. І першымі сярод тых, хто адваёўвае ў прыроды яе сакрэты, ідуць людзі, выхаваныя Камуністычнай партыяй.

Слава вам, мужныя сокалы, неспакойныя даследчыкі!

Слава вам, чырвоныя зоры!

Натан ВОРАНАЎ,
заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

МІНУЛЫЯ гады мы стараліся памагчы нашым культасветустановам як мага лепш адзначыць 50-годдзе Вялікага Кастрычніка і 50-гадовы юбілей БССР і КПБ. Папрацаваць давялося нямала. Вывучылі і абагульнілі вопыт выхавання моладзі на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях ва ўсіх лепшых культасветустановах рэспублікі. У выніку з'явіўся вялікі зборнік «Шляхі бацькоў — дарогі сыноў». Матэрыялы гэтай кнігі дапамаглі асяродкам культуры лепш наладзіць работу перад юбілеем рэспублікі.

Сёлета наша арганізацыйна-метадычная работа праходзіць пад дэвізам дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Па выдавецкаму плану, зацверджанаму калегіяй Міністэрства культуры, мы павінны выдаць 27 метадычных дапаможнікаў. Усе яны аб тым, як праводзіць клубныя мерапрыемствы, прысвечаныя ленінскаму юбілею, як ствараць клубную Ленініяну, прапагандаваць бессмяротныя ідэі Ільіча. Друкарскім спосабам выдадзена метадычная распрацоўка «Клубная Ленініяна» і другая—«Ленін з намі навекі», надрукаваная на ратапрынце. Падрыхтаваны да друку распрацоўка «Ленін і музыка», сцэнарый светагукавой газеты «Ленінскі геній у справах пакаленняў». Рыхтуецца зборнік артыкулаў «Мы справе Леніна і партыі верныя». Падрыхтаваны ўжо дзве брашуры, якія раскажуць аб вопыце работы двух дамоў культуры — Лёзненскага раённага і Віцебскага гарадскога.

ДЛЯ КЛУБНАЙ ЛЕНІНІЯНЫ

Расказвае дырэктар Рэспубліканскага метадычнага кабінета культасветработы Л. МЫСЛІВЕЦ.

Мы ўважліва сочым за ходам Усесаюзнай пераклічкі сельскіх клубаў, прысвечанай 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна. Вопыт лепшых клубных установаў, якія добра папрацавалі ў ходзе пераклічкі, намі абагульняецца і прапагандуецца. Выйшла з друку і разаслана на месцы брашура «На прыкладзе традыцый», якая расказвае аб вопыце Шчадрынскага сельскага Дома культуры Жлобінскага раёна. Хутка будзе надрукавана брашура «Клуб выдатнай работы» — аб Славінскім сельскім клубе Шклоўскага раёна.

Усяго сёлета за дзевяць месяцаў выпушчана 14 брашур і метадычных распрацовак, тры — у стадыі вытворчасці. Ідзе работа над астатнімі дзесяццю брашурамі. Адна з іх прысвечана рабоце лепшых універсітэтаў культуры рэспублікі, якія ўмела прапагандуюць ленінскую тэарэтычную спадчыну.

Зараз усе нашы ўстановы культуры рамантуюцца, у большасці з іх абнаўляецца наглядная агітацыя. Метадычны кабінет падрыхтаваў серыю эскізаў нагляднай агітацыі (мастак В. Бабіцкі) для ленінскіх пакояў і куткоў, для афармлення клубных інтэр'ераў. На нашу думку, усе яны цікавыя і з'явяцца добрым дапаможнікам пры афармленні клубаў. Эскізы скора выйдуць з друку.

Апрача выдавецкага ёсць і іншыя напрамкі дзейнасці рэспубліканскага метадычнага кабінета. Мала выдаць карысны метадычны дапаможнік. Нашы работнікі часта выязджаюць на дапамогу сельскім работнікам культуры, інструктуюць іх, раяць, як лепш ажыццявіць тое або іншае мерапрыемства. Нашы работнікі прымаюць удзел у раённых семінарах, якія збіраюцца кожны квартал. Летась у Гомелі і Гродна прайшлі куставыя нарады культасветработнікаў, у якіх прынялі ўдзел камсамольскія работнікі і навуковыя работнікі з Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, вопытныя дзеячы культуры з Прыбалтыкі, РСФСР, Украіны. Зараз мы таксама рыхтуем два занальныя рэспубліканскія семінары маладых культасветработнікаў і камсамольскіх актывістаў. Яны адбудуцца ў Баранавічах і Віцебску. На гэтых нарадах не толькі будуць прачытаны цікавыя лекцыі і даклады, заслуханы паведамленні з месц, але і адбудзецца абмен думкамі, як лепш наладзіць работу клубных устаноў перад ленінскім юбілеем.

З дапамогай нашых работнікаў арганізаваны кабінеты метадычнай работы пры раённых дамах культуры ў Крупках, Камянцы, Лепелі, Бабруйску, Асіповічах, Кобрыне і дзесятку іншых раёнаў. Мы сістэматычна правяраем іх работу, уплыў на нізавыя культасветустановы. Па ўсім відаць, што названыя метадычныя кабінеты ўжо можна з поўным правам назваць нашымі філіяламі.

Пры рэспубліканскіх пастаянных 10-месячных курсах ужо другі год працуюць курсы для перападрыхтоўкі работнікаў культуры. Летась павысілі сваю кваліфікацыю дырэктары ўсіх раённых дамоў культуры, загадчыкі аддзелаў культуры. Сёлета займаюцца метадысты РДК, масавікі-забаўнікі, інспектары аддзелаў культуры. У наступны год прыедуць вучыцца сельскія культасветработнікі.

Мы вучым работнікаў культуры валодаць фота- і кінаапаратурай, здымаць аматарскія фільмы на тэмы культурнага жыцця, скарыстоўваць эпідыяскопы, магнітафоны і г. д. Паказваем слухачам курсаў каляровыя дыяпазітывы, якія расказваюць, як арганізаваць народныя святы, гулянні ці іншую ўрачыстасць, фільмы «Свята на Нарачы» і «Жывуць героі ў памяці народнай». Апошняя стужка — пра тое, як у калгасе імя Фрунзе Бялыніцкага раёна прайшла тэарэтычная канферэнцыя, прысвечаная палымянаму ленінцу, імя якога носіць сельгасарцель. На гэту канферэнцыю з'ехаліся з усяго Саюза паплечнікі М. В. Фрунзе. Прыкладна па гэтым ўзоры можна арганізаваць канферэнцыі ў іншых сельгасарцелях, якія носяць імёны дзеячоў рэвалюцыі, герояў грамадзянскай і Айчыннай войнаў.

Работнікі метадычнага кабінета робяць усё магчымае, каб нашы культасветустановы як мага лепш сустрэлі слаўны ленінскі юбілей.

50 ГАДОЎ ТАМУ...

Гэтаму кінакадру споўнілася паўвека. Яго часта рэпрадуцыруюць, як дакументальны і па-мастацку абагулены...

Сярод кінааператараў, якія ўвекавечылі на вякі выступленне У. І. Леніна ў гэты дзень, быў Мікалай Феафанавіч Казлоўскі, трохі пазней штатны аператар фабрыкі «Белдзяржкіно». Тут ім былі зняты гісторыка-рэвалюцыйны мастацкі фільм «Яго яснавяльможнасць», першая беларуская сатырычная камедыя «Джэнтльмен і певень» прыгодніцкая карціна «Хвоі гамоняць» па аповесці Анатоля Вольнага, першыя беларускія мультыплікацыйныя і навукова-папулярныя стужкі.

Але спынімся на тым гістарычным кадры.

У трыццаць дзевятым томе твораў У. І. Леніна 5-га выдання ў датах жыцця і творчасці правадыра за чацвер, 16 кастрычніка 1919 года, паведамляецца: «Ленін гаворыць прамову з балкона будынка Маскоўскага Савета перад мабілізаванымі рабочымі — камуністамі Яраслаўскай і Уладзімірскай губерніі». З газетнага рэпартажа пяцідзесяцігадовай даўнасці даведваемся, што побач з Уладзімірам Ільічом на балконе знаходзіўся і таксама выступаў з прамовай А. Ф. Мяснікоў, адзін з арганізатараў Савецкай улады ў Беларусі.

«Дні паміж 11 і 16 кастрычніка 1919 г. былі самымі трывожнымі...—піша ў сваіх «Успамінах пра Уладзіміра Ільіча Леніна» галоўнакамандуючы Узброенымі сіламі савецкай дзяржавы С. С. Каменеў.—Данясенні з франтоў атрымліваліся амаль не штогадзінна... Усе важнейшыя данясенні і рашэнні, якія прымаліся, т. Склянскі перадае неадкладна па тэлефоне ў Крэмль Уладзіміру Ільічу... Больш складанага становішча я за ўвесь перыяд грамадзянскай вайны не памятаю...»

Праездам на фронт тады зрабілі прыпынак у Маскве 400 камуністаў. З Яраслаўскага вакзала пад гукі аркестра яны накіраваліся да будынка Паліткома на Срэценцы. Тут іх вітаў ад імя ЦК А. В. Луначарскі. Потым калоны пайшлі ў напрамку плошчы да дома № 31 па Цвярской вуліцы (цяпер вуліца Горкага, дом 13).

Загадчык Усерасійскага фотакінааддзела Д. І. Лешчанка ў сваім кабінеце ў каторы раз вылічваў, ці хопіць кінаплёнкі для здымак вялікага свята—другой гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Некальні дзён назад на фронт пад Тулу паехаў з цэлай каробкай плёнкі аператар Пётр Ярмолаў. Толькі-толькі ён падпісаў камандзіроўку на фронт Пятру Навіцкаму і таксама выдаў каробку плёнкі. І вось у гэты час па тэлефоне паведамілі, што перад Массаветам чакаецца выступленне У. І. Леніна. Д. І. Лешчанка неадкладна адшукаў дзяжурнага аператара Рыгора Гібера і адразу ж накіраваў яго на месца здымкі. Тэрмінова пазванію П. Навіцкаму...

Трэба спяшацца туды, дзе будзе выступаць Ільіч!

У Мікалая Казлоўскага быў свабодны ад работы дзень. Праходзячы паблізу Массавета, ён заўважыў, што на плошчы збіраецца народ. Апаратарскае чуццё падказала яму, што тут адбудзецца важная падзея, і ён амаль пабег па кінакамеру.

Утрох гэтыя аператары і рабілі здымкі гістарычнай падзеі.

...Стройнымі радамі выстраіліся на плошчы атрады рабочых. Вецер калыхаў сцягі. З'яўленне Леніна на балконе сустракаецца громам апладысментаў.

— Вы ведаеце з газет, у якіх мы друкуем усю праўду, не хаваючы нічога, — гаварыў Уладзімір Ільіч, — якую новую і грозную небяспеку нясуць царскі генерал Дзянікін узяццем Арла і Юдзеніч—пагрозай чырвонаму Піцеру...

У прамове У. І. Леніна ад 16 кастрычніка, якая дайшла да нас толькі ў хранікёрскім запісе, не аналізуецца становішча на ўсіх франтах і напрамках. У аператыўнай зводцы за 16 кастрычніка 1919 года чытаем: «У Лепельскім напрамку нашы часці адышлі на новыя пазіцыі ў 25 вярстах на паўднёвы ўсход ад Полацка. У Мазырскім раёне ідуць баі ў 35 вярстах на захад ад Мазыра».

Мы ведаем, што Уладзімір Ільіч і ў гэтыя дні рабіў усё магчымае для таго, каб нованароджаная, шматпакутная і няскораная белапольскім акупантам Беларуская Савецкая Рэспубліка змагла ўстаць на ногі...

У час прамовы Ільіч прахаджваўся па балконе. Церушыў дожджык. Вецер кідаў кроплі ў твар. Але ніхто гэтага не заўважаў. Слухалі правадыра.

Гісторыя не захавала нам прозвішча прадстаўніка, які выступіў са словам у адказ ад імя камуністаў, якія ехалі на фронт: «Я гавару вам не «бывайце», а «да пабачэння», чакайце нас сюды з перамогаю». Мы, відаць, так і не даведаемся, ці застаўся ён у жывых, гэты безымянны таварыш, але тое, што абавязак ён свой, як і тысячы іншых, выканаў да канца — у гэтым няма сумнення.

Мікалаю Феафанавічу Казлоўскаму пашчасціла здымаць У. І. Леніна яшчэ два разы: у ліпені 1921 года і 13 лістапада 1922 года на III і IV кангрэсах Камінтэрна. А яшчэ М. Казлоўскі і М. Грыгар разам з байцамі і палітработнікамі прайшлі пад агнём па лёдзе Фінскага заліва, каб зняць на плёнку ліквідацыю контррэвалюцыйнага Кранштацкага мяцяжа. Гэта яго, Казлоўскага, камандзіруюць на Генуэзскую канферэнцыю. (Дарэчы, гэтыя матэрыялы ў многім дапамаглі здымачнай групе «Беларусьфільма» пры стварэнні мастацкай карціны «Масква—Генуя»).

І наогул гэта быў чалавек вельмі цікавай біяграфіі. Былы фатограф, ён самастойна авалодаў прафесіяй аператара і ў 1908 годзе разам з А. Дранковым зняў першы рускі мастацкі фільм «Панізавая вольніца». Да 1917 года ён прыняў удзел у стварэнні 60 карцін. Найбольш цікавыя—«Абрыў», «Злачынства і пакаранне», «Браты Карамазавы». Ён здымаў Л. Талстога, І. Рэпіна, Л. Андрэева. З мастацкіх карцін, знятых ім у савецкі час, найбольшай вядомасцю карысталася камедыя «Цудадзей» (1922 год), аб якой, па сведчанні Н. К. Крупскай, станоўча адгукаўся Уладзімір Ільіч.

Аб тым, што гэта быў рознабакова адораны чалавек, сведчыць і такі факт: у 1932 годзе ў вядомым фільме «Сустрэчны» (рэжысёры Ф. Эрмлер і С. Юткевіч) ён у якасці акцёра выканаў адну з галоўных роляў — інжынера Лазарава.

У мемуарах першага дырэктара «Белдзяржкіно» Міхася Крэсіна «На жыццёвым шляху» Мікалаю Феафанавічу прысвечана шмат радкоў. Вось толькі маленечкі ўрывак з гэтых успамінаў: «Дабрадушны, чулы, сціплы, ён з радасцю і самаахвярна аддаваўся любімай справе. Неяк у час адной са сваіх апошніх работ, ужо ў 70-гадовым узросце, ён без усялякага страху палез з апаратам на самае высокае месца Ісаакіеўскага сабора, патрабаваў зрабіць яму там, на велізарнай вышыні, масцік для апарата і з гэтага мастка здымаў патрэбныя кадры».

Творчы чалавек пакідае пасля сябе скарб, які часам цяжка ацаніць, але ўжо адно тое, што гэты дакументальны кадр, на якім мы бачым жывы і непаўторны вобраз У. І. Леніна ў самыя напружаныя дні грамадзянскай вайны, даў у Ленініяну сціплы і таленавіты кінематаграфіст, робіць дарагім для нас імя аператара Мікалая Казлоўскага. Прыемна, што ён быў пэўны час калегам беларускіх кінематаграфістаў.

І. РЭЗНІК.

ТЭАТР НА ВУЛІЦЫ ВАЛАДАРСКАГА АДКРЫВАЕ ЗАСЛОНУ

Ганна АБУХОВІЧ,
народная артыстка БССР.

СЁЛЕТА наш тэатр пачынае сезон у родным горадзе са спазненнем, якое тлумачыцца не зусім традыцыйнымі тэрмінамі гастроляў. Адразу пасля адпачынку трупа выправілася ў вялікае падарожжа па Прыкарпацкай Украіне і Малдавіі. Такім чынам, мы прыехалі ў Мінск пасля трохмесячнай разлукі і, шчыра кажучы, неяк асабліва пільна прыглядаліся ў першыя дні да гэтых нашых светлых у золаце восені вуліц і плошчаў, зноў і зноў адкрываючы хараство горада на беразе Свіслачы. Там, на гастролях, нас акрыляла пачуццё адказнасці за сваю творчасць, пачуццё, з якім мастак заўсёды прадстаўляе мастацтва за межамі сваёй рэспублікі. Нашым клопатам было імкненне высока пранесці годнасць артыстаў з Беларусі.

Перш чым пачаць гаворку пра новы сезон, я хачу падзяліцца некаторымі думкамі, што з'явіліся вынікам далёкага падарожжа і сустрэчы з родным горадам пасля доўгай адсутнасці ў ім. Добра, калі сустракаеш знаёмыя дамы і знаёмых людзей такімі, якімі іх ведаеш і любіш. А вось на сцэне, у нашай творчасці, нам варта змагацца з усім, што даўно знаёма гледачу, з будзённым і звычайным. Спектакль — гэта свята і для нас, акцёраў, і для гледачоў. Ісціна, здаецца, вядомая. Але кожны раз, асабліва перад новай аўдыторыяй на гастролях, спасцігаеш яе нанова. Прыкра бывае, калі бачыш, што па розных прычынах часам свята не адбываецца, прынамсі, свята ў поўным сэнсе гэтага слова.

Гледачы ў Чарноўцах і ў Кішынёве добра прымалі спектаклі Дзяржаўнага рускага тэатра БССР імя М. Горкага. Поспехам карысталася «Узнятая цаліна», якой мы пачыналі свае выступленні. У час шматлікіх творчых сустрэч з гледачамі закраналіся самыя розныя пытанні творчага жыцця тэатра. Асабліва мне запомнілася гутарка з камсамольскім актывам у летнім лагеры непадалёку ад Чарноўцаў. Так, моладзі патрэбны спектаклі вялікага палітычнага гучання, жыццёвай праўды і складаных характараў, — такія, як «Узнятая цаліна».

І я думаю, што дарэмна мы так рэдка іграем (часцей за ўсё аднаўляем напярэдадні гастрольных паездак) тое, што было нашым сапраўдным поспехам і ўзбагачала рэпертуарную афішу. Маю на ўвазе, напрыклад, «Барабаншчыцу»; хоць неўзабаве гэта драма будзе намі паказана ў пяцісоты раз, у Мінску мы яе даём усё радзей і радзей. А талстоўская «Улада цемры», «Аптымістычная трагедыя» Ус. Вішнеўскага, «Галоўная стаўка» К. Губарэвіча, а горкаўскія пастаноўкі... Відаць, трэба прыняць пэўныя захады, каб гэтыя пастаноўкі абавязкова штомесячна паказваліся гледачам. Гэта пашырыць і нашы магчымасці ў рабоце з маладой акцёрскай зменай, бо выканаўцы галоўных роляў будуць перадаваць творчую эстафету выхаванцам інстытута і тэатра. Як гэта, скажам, робіцца ў «Барабаншчыцы», дзе галоўную ролю пасля А. Клімавай і Л. Весніной цяпер іграе В. Клебановіч.

У гарадах, дзе давялося выступаць, калектыў знаёміўся з гістарычнымі падзеямі і выдатнымі мясцінамі. Мы прагна слухалі бывальшчыну і легенды. Нам было радасна, што нашы гастролі адбываліся тады, калі малдаўскі народ святкаваў дваццаць пятую гадавіну вызвалення рэспублікі ад фашысцкіх акупантаў. Уражанняў многа — самых разнастайных.

Былі, вядома, і прыкрыя выпадкі. Напрыклад, не вельмі ўдала арганізавалі мы паслядоўнасць у рэпертуары спектакляў у Чарноўцах, а таму, мабыць, і не прыцягнулі ўвагу большасці гледачоў. Нашы новыя сябры адзначалі, што трупа тэатра мае вельмі цікавых акцёраў і каштоўны рэпертуарны фонд: сучасныя, маладзёжныя па праблематыцы п'есы і ўзоры класічнай драматургіі, камедыі і маштабныя гісторыка-рэвалюцыйныя творы. Аншлагі ў Кішынёве (калектыў іграў на сцэне Рускага тэатра МССР, імя А. Чэхава) пацвярджалі гэтую характарыстыку. Гледачы апладзіравалі і «Маскараду» М. Лермантава, і «Дурнічцы» Лопэ дэ Вэгі, і драме «Пад адным небам» А. Маўзона, і «Вяселлю на ўсю Еўропу»...

Адначасова трупа працягвала рэпетыцыі. Тэатр паказаў кішынёўцам спектакль, які мінчане яшчэ не бачылі — «Падарожны без багажу» Ж. Ануя ў пастаноўцы рэжысёра А. Даброціна і ў дэкарацыях, зробленых па эскізах мастака В. Галубовіча. Пачалася работа над сцэнічным увасабленнем шылераўскай «Марыі Сцюарт» у рэжысуры Ф. Шэйна. Мастацкі савет прыняў і эскізы афармлення, прапанаваныя мастаком В. Сцяпанавым. У спектаклі заняты вядучыя майстры тэатра — А. Клімава, І. Лакштанава, А. Шах-Парон, Р. Янкоўскі, І. Ражба і Ю. Сідараў.

Гастрольныя месяцы былі запоўнены інтэнсіўнай работай. Трэба ўлічыць яшчэ, што тэатр даў 116 спектакляў — 75 на стацыянарных пляцоўках, 39 на выязных і 2 па тэлебачанні.

За паспяховае правядзенне гастроляў Прэзідыум Вярхоўнага Савета Малдаўскай ССР узнагародзіў Дзяржаўны рускі тэатр БССР імя М. Горкага Ганаровай граматай. Прадстаўнікі грамадскасці на Украіне і ў Малдавіі на развітанне перадавалі праз нас шчырае братэрскае прывітанне працоўным Беларусі.

Заўтра тэатр адкрывае свой 38 сезон. Калектыў разумее, што прадстаіць вялікая і напружаная творчая праца. З пачуццём адказнасці мы будзем рыхтавацца да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. Хараство і сіла нашага тэатральнага мастацтва—у яго партыйнасці і народнасці, у праўдзівым паказе рэальнага жыцця, у правільным разуменні класічнай спадчыны. Калектыў Рускага тэатра БССР імя М. Горкага прыкладзе ўсе намаганні, каб гэтае хараство і гэтая сіла пераходзілі ў змест і форму кожнай новай прэм'еры і захоўваліся ў спектаклях ранейшага рэпертуару.

Нам прыемна, што двум нашым калегам— А. І. Клімавай і Я. М. Палосіну — прысвоена ганаровае званне народных артыстаў Саюза ССР. Такая ацэнка іх творчай працы — гонар для ўсёй нашай трупы. Напярэдадні адкрыцця сёлетняга сезона у нас актывізуецца дзейнасць мастацкага савета і грамадскіх арганізацый — мы плануем мерапрыемствы па паляпшэнні выхаваўчай работы ў калектыве, творчых кантактаў з прадпрыемствамі, навучальнымі установамі горада, удакладняем формы супрацоўніцтва з калектывам камвольнага камбіната, з якім падпісалі дагавор аб узаемным шэфстве.

А заўтра... Заўтра мы будзем сустракаць першых нашых гледачоў кастрычніка 69 года. Хвалявацца будзем. Хаця хвалявацца нам прадстаіць не толькі заўтра — на гэтым тыдні мінчане пазнаёмяцца з двума прэм'ерамі Рускага тэатра БССР імя Горкага: з «Падарожным без багажу» і з новай п'есай А. Маўзона «Толькі адно жыццё».

Гасцінна запрашаем да нас, на вуліцу імя Валадарскага!

НА ПРАЕКТНЫХ ПЛАНШЭТАХ—ДОМ КІНО

УПРАЎЛЕННЕ па справах будаўніцтва і архітэктуры Мінскага гарвыканкома ўхваліла праект рэканструкцыі будынка былой студыі хранікальна-дакументальных фільмаў. Тут размесціцца Дом кіно Саюза кінематаграфістаў БССР.

Архітэктары інстытута «Белкамунпраект», якім была даручана распрацоўка праекта, прапанавалі захаваць існуючыя фасады і элементы афармлення будынка і знесці ўсе пазнейшыя адна- і двухпавярховыя прыбудовы. Выключэнне зроблена для паўкруглай трохпавярховай прыбудовы, якая будзе абліцавана пліткамі, што імітуюць цэглу. Будзе заменена дахавае крыццё (чарапіцу зробяць па ўзорах старой), аднаўлены вітражы. Будынак, характэрны сваім сілуэтам, выразнымі вертыкальнымі чляненнямі, адзінствам колеравага вырашэння, зойме дастойнае месца ў ансамблі плошчы Леніна.

Згодна з праектам, зносяцца ўсе агародкі вакол будынка студыі. Некранутай застанецца толькі выкладзеная з калатага каменю чырвонага граніту падпорная сценка, якой тэрыторыя студыі была аддзелена ад праезджай часткі вуліцы. На натуральным узвышэнні будзе разбіты дворык для адпачынку з фантанам і скульптурнай групай. Хмызняковы бардзюр, зялёныя лужкі, маляўнічыя кампазіцыі з каменю, вымашчаныя белымі пліткамі дарожкі і пляцоўкі — усё гэта ў спалучэнні з чырвонай цэглай сцен і мазаікай ганкаў створыць выразную ігру матэрыялаў і форм, каляровых тонаў.

Левае крыло будынка з боку плошчы было раней галерэяй. Ёй надаецца першапачатковы выгляд.

Галоўны ўваход у Дом кіно запраектаваны з боку вуліцы Берсана. З вестыбюля можна будзе трапіць у фае-гасціную і глядзельную залу, у пакоі дырэкцыі і бюро прапаганды кінамастацтва. Глядзельная зала праз гасціную звязваецца з унутраным дворыкам. З выхадам на вуліцу Савецкую запраектаваны кніжны кіёск, вырашаны ў адным стылі з будынкам. Тут можна будзе набыць літаратуру па мастацтве, перыядычныя кінавыданні, партрэты артыстаў.

Другі паверх Дома кіно адведзены пад канферэнц-залу, чытальную залу з кнігасховішчам, більярдную і кафэ. Кафэ і більярдную аддзяляюць ад галоўнай залы шкляныя, аздобленыя металам, перагародкі. Пры патрэбе пакоі можна будзе аб'яднаць у адзін аб'ём.

Распрацоўваючы інтэр'еры, архітэктары ставілі перад сабой задачу падкрэсліць жывапісную старызну і разам з тым, ствараць сучасны камфорт. Пры аддзелцы будуць ужыты каменная тынкоўка, медзь, чорны каваны метал. Спалучэнне маляўнічых вітражоў са спакойнымі светлымі сценамі і вытрыманай у адной гаме мэбляй падкрэсліць грамадскі характар інтэр'еру. Па індывідуальных малюнках будуць выкананы для Дома кіно і свяцільнікі.

Асноўным ядром будынка стане глядзельная зала. У ёй больш чым 200 месц. Тут будуць наладжвацца кінасеансы, сходы, канферэнцыі, лекцыі, праводзіцца сустрэчы з дзеячамі кіно. Нямала цяжкасцей давялося вырашыць, каб забяспечыць добрую акустыку ў зале. З гэтай мэтай на столі будзе зроблена спецыяльная падвесная столь, сцены абліцоўваюцца газабетоннымі пліткамі, вырашанымі ў стылі ўсяго будынка. Выключэнне складае толькі падлогі, яна з паркетных клёпак рознага тону і мазаікі-тэраца.

Вонкавая аддзелка будынка звядзецца да рэстаўрацыі пашкоджаных месц на фасадах і аднаўлення цаглянай кладкі ў колеры і фактуры існуючых сцен у тых месцах, дзе будуць разабраны прыбудовы. Уваходныя драўляныя дзверы архітэктары ўсюды замяняюць шклянымі з накладным металічным каваным малюнкам. Гэта палепшыць асвятленне вестыбюляў і створыць дадатковыя эфекты ўвечары. Патокі святла хлынуць у памяшканне, калі разгародзяць вокны і рэстаўрыруюць вітражы. Святло стане выяўленчым пачаткам у інтэр'еры.

Праект рэканструкцыі (над ім працавала група ў складзе І. Міхайлавай, В. Чыстоўскай, У. Шынкевіча, А. Агроніна) можна разглядаць, як адзін з удалых прыкладаў выкарыстання будынкаў культавага прызначэння ў сучасных мэтах. Праект абмеркаваны і прыняты Саюзам кінематаграфістаў БССР. У інстытуце прыступілі да выпрацоўкі рабочых чарцяжоў.

М. БАРЫСАЎ.

Куточак будучага Дома кіно.

ПАРА КЛОПАТАЎ І ПАДРАХУНКАЎ

Дзіўная гэта пара года — восень. Жаданая і нежаданая... Толькі, здавалася б, увабралася ў сілу лета — не паспела як след адбуяць пышнай зеленню, адзвінець яркімі лугавымі краскамі, адспяваць звонкімі птушынымі галасамі, адшумець цёплымі навальнічнымі ліўнямі, а ўжо, глядзі, і яна ідзе — з парывістымі, халоднымі вятрамі, з нуднымі зацяжнымі дажджамі, з непрыемнай хлюпатой пад нагамі, з цёмнымі, хоць вока выкалі, і доўгімі начамі. Гэта — з аднаго боку. А з другога — харошая яна пара, восень, асаблівá, калі выдасца лагоднай, сухой, звонкай. Радуе тады чалавека ўсё: і стомленае пакрэктванне важкіх галін у садзе, і салодкі пах свежага зерня ў засеках, і статкі стагоў на нязвычна пашырэлых лугах, і мядзяны звон барвовага лісця, і празрыстая сінь спакойнага неба, і нейкі асабліва звонкі і шырокі прастор апусцелых палёў.

Думалася пра гэта па дарозе ў Любань, дакладней — на Любаншчыну, слаўную сваёй партызанскаю і працоўнаю славаю...

Маленькі «АН-2», быццам безабаронны перад павевамі халоднага, часам з сякучым даждЖом, ветру, то завальваецца на адзін, на другі бок, то нырае ўніз, ад чаго непрыемна халодзіць у грудзях, то, нібыта зазлаваўшы, натужна лезе ўверх. Адчуванне такое, быццам самалёцік не ляціць, а паўзе па тых узгорках і лагчынах, лясах і пералесках, што паволі адплываюць пад крыламі назад, — блізка, рукой падаць. Выгляд тых узгоркаў і лагчын даволі самотны. Можна толькі здагадвацца, што ось гэты, прама пад табой, шэры прамавугольнік калісьці жаўцеў спелай збажынай, што ось на тым шнуры, які выцягнуўся ўздоўж лесу, некалі пенілася белым цветам грэчка, а ось тут, ускрай рэдкага, балоцістага хмызняку, сакавіта-зелена лапушылася бульба(так і ёсць: па загоне сунецца трактар з капалкай, а за ёй — купка людзей-мурашак). Восень сцёрла летнія фарбы гэтых прамавугольнікаў і квадратаў і паклала сваю — шэра-аднастайную, сумную. Калі і не зусім сцёрла, дык, прынамсі, добра-такі знівеліравала адценні. Аб тым, што на гэтых загонах і сенажацях некалі квітнела жыццё, цяпер сведчаць толькі скірды саломы ды стагі сена.

Прыгадваліся радкі Якуба Коласа:

Нікла жыцце ў цёмным лесе,
Агаляўся твар зямлі,
І ляцелі ў паднябессі
З сумным крыкам жураўлі.

Мой сусед і адзіны спадарожнік (болей пасажыраў не прычакалі), па ўсім відно, дзядзька вясковы, які па нейкай патрэбе лятаў у сталіцу і цяпер, апошнім рэйсам, вяртаецца дадому, адрываецца ад акенца, нахіляецца да мяне:

— Каровам зараз рай. Не пастух іх пасвіць, а яны пастуха. Унь, бачыце, па ўсяму полю разбрыліся.

— Шкоды няма, — адгукаюся, — от і брыдуць, куды хочуць. А пастух за імі.

Суседу, мусіць, карцела пагаманіць, бо ён тут жа падсунуўся бліжэй — каб не крычаць:

— Толькі аднаму пастуху і палёгка ўвосень. На зіму ў яго і саўсім водпуск. А так дзеравенскаму народу клопату таго не меншае. А сёлета дык асабліва бог даў. І вясны, лічы, не было, і лета партачыла, а восень — ліха на яе, такую восень! Радыё ўсё прагнозам пужае, кожны дзень. Жніва не скончылі, нават сена па-людску не накасілі, а тут ужо і бульбу трэба выхопліваць, і буракі. А дзе ў каго дык яшчэ і грэчка стаяла, і канюшына даспявала. Хоць ты рук пазычай, каб усюды выстарчыла.

Дзядзька выцягнуў з кішэні пачак «Северу», але, схамянуўшыся, зноў схаваў яго, крактануў:

— Добрая машына, гэтая страказа. Выгадная. За якой паўгадзіны і дома. Адно кепска — курыць няможна... Дык я от і кажу. Сёлетняя восень благая выдалася. Хоць і лета прыхапіла, а і сама не пакрасавалася, і людзям во не спрыяе. Ды і ўвесь год быў нейкі нягеглы...

Так, сапраўды, сёлетні год не песціў хлебаробаў. Вясна, парушыўшы ўсе нябесныя графікі, прыйшла занадта позна, лета было капрызнае — дзе мачыла, а дзе сушыла, і восень — таксама не з лепшых. Але, не дужа шчодрая на цяпло і сонца, на яркую барвовасць лясоў, восень аказалася на дзіва шчодрай на хлеб. Даўно не было ў Беларусі такога ўраджаю жыта, пшаніцы, ячменю, аўсу, як сёлета. Ды яна аказалася шчодрай не толькі на хлеб — і на бульбу, і на лён, і на буракі, і, трэба думаць, на малако, мяса і сала. Адусюль, з усіх куткоў рэспублікі, ідуць у гэтыя дні радасныя весткі аб багатым плёне, якім увянчалася сёлета праца хлебаробаў. Гэты багаты плён бачыў я на Любаншчыне, у прыватнасці, у калгасе імя Суворава, дзе правёў некалькі дзён пачатку кастрычніка.

Калгас імя Суворава, відаць, і цяпер не самая багатая гаспадарка на Любаншчыне сярод такіх гаспадарак, як саўгасы «Любанскі», «10 год БССР», калгас імя БВА, слава якіх сягнула далёка за межы рэспублікі. Паспрабуй, пацягаіся з такімі кітамі! Тым больш, што ўсяго нейкіх гадоў пяць—шэсць, а то і меней, назад суворваўцы ўвогуле не падымаліся вышэй другой паловы ў раённых зводках. Праўда, сёння калгас далёка не той, якім ён быў, скажам, у 1965 ці нават у 1966 гадах (сёлета, напрыклад, ён сабраў самы высокі на Любаншчыне ўраджай зерня — 33,6 цэнтнера з гектара на круг), але, паўтараю, усё ж... Галоўнае, што гаспадарка моцна стала на ногі, што яна, з кожным годам набіраючы тэмпы, упэўнена крочыць у будучыню.

У канторы калгаса мне назвалі некаторыя лічбы, якія гавораць сёе-тое аб сённяшнім дні гаспадаркі. Асноўныя фонды ўзраслі з 621 тысячы рублёў у 1961 годзе да 1 мільёна 800 тысяч рублёў у мінулым. Летась калгас атрымаў 1 мільён 229 тысяч рублёў грашовага даходу, з іх чысты прыбытак склаў 459 тысяч рублёў. Сёння ў гаспадарцы — 58 трактараў, 30 аўтамашын, 14 зерняВых камбайнаў і 8 бульбаўборачных, 12 бульбакапалак, шмат іншых машын і механізмаў. На фермах — 600 кароў і каля 3 тысяч свіней. Калгас вытварае і прадае каля 500 тон мяса — 120 цэнтнераў на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў. На гаспадарчае і культурна-бытавое будаўніцтва тут выдаткоўваецца ў год каля 400 тысяч рублёў. Кошт аднаго працадня летась быў 4 рублі 93 капейкі...

З БЛАКНОТА ЖУРНАЛІСТА

КАРМІЦЕЛІ

Мікола ГІЛЬ

Але, прызнаюся, сэрцу майму, мусіць, больш, чым гэтыя лічбы, сказалі горы зерня (яго намалочана больш 3 тысяч тон, ім засыпаны ўсе свірны, яно ляжыць пад паветкамі і ў недабудаванай пакуль што майстэрні), свежыя бурты бульбы, якія раслі літаральна на вачах (бульба ўрадзіла — 190—200 цэнтнераў з гектара); сказалі цалкам механізаваныя кароўнікі і свінарнікі — новыя, дабротныя, пабудаваныя не на дзень, не на два, а на дзесяцігоддзі, новы, двухпавярховы Палац культуры, які павінен гасцінна адчыніць свае дзверы на Кастрычніцкія святы; сказала заможнасць, заручаная з сённяшнімі ўяўленнямі і патрабаваннямі да культуры быту, у хатах калгаснікаў.

Усё пабачанае хвалявала і радавала. Станавілася светла на душы, хоць дні якраз стаялі дажджлівыя і халодныя. І думалася: якая лічба можа ўзрушыць больш, чым паўнюткі, пад самую столь, свіран, чым халодная, духмяная цеплыня жмені важкага, сонечнага зерня! За ёй, гэтай жменяй зярнят, — праца чалавека, праца цяжкая, карпатлівая, праца, даўжынёю ў год, свянцоная сонцам, дажджом і потам, праца на золку і на заходзе сонца, у будзень і ў свята, — самая святая праца на зямлі. За ёй, гэтай жменяй зярнят, —сам чалавек: ратай, сявец, касец, жнец і малацьбіт. А за ім, чалавекам, — гісторыя калгаса, яго сённяшні і заўтрашні дзень.

І, ходзячы па вуліцах вёскі Рачэнь (харошую, чыстую і звонкую назву мае цэнтральная сядзіба калгаса імя Суворава), знаёмячыся з тым, як жывуць і працуюць там людзі, што яны маюць сёння і што хочуць (і будуць!) мець заўтра, я больш за ўсё прыглядаўся да іх саміх — да людзей, якія аддаюць свае сілы, розум і любоў зямлі-карміцельцы.

Пра некаторых з іх паспрабую расказаць...

ПАРТЫЙНЫ САКРАТАР

Фармальна ён нават не калгаснік. Ён — дырэктар мясцовай дзесяцігодкі: кіраўнік настаўніцкага і вучнёўскага калектыву, настаўнік (ён выкладае рускую літаратуру), гаспадарнік. А яшчэ — сакратар парткома калгаса. І не бяруся гадаць, чаму ён аддае больш увагі, часу, энергіі — рабоце, за якую яму плоцяць зарплату, ці той, якая прыбаўляе да яго прозвішча, акрамя дадатка «дырэктар школы», яшчэ адзін: «сакратар парткома». Відаць, ён з катэгорыі тых людзей, якія надзелены зайздросным умельствам спалучаць і тое, і другое, а, дакладней, з катэгорыі тых, якія адораны талентам — усюды быць патрэбнымі людзям.

Зваць яго — Мікалай Яўсеевіч Гарбач. Невысокага росту, светлавалосы, надзвычай рухавы, лёгкі, як кажуць, на пад'ём. Пра апошняе красамоўна сведчаць вочы — жывыя, усмешлівыя. Затое, дзіўна, не вельмі гаваркі. Прынамсі, пра сябе ён сказаў коратка:

— Маю ад роду трыццаць пяць. Вучыўся ў Слуцкім педвучылішчы. Потым, завочна, у Мінскім педагагічным. Зараз тут. Працую, як магу і ўмею.

А вось пра людзей вёскі гаварыў ахвотна і хораша.

Мікалай Яўсеевіч быў маім гідам па арцельнай гаспадарцы. Агледзелі з ім будаўніцтва Палаца культуры і двухпавярховага адміністрацыйнага будынка, кацельнай, пабывалі ў кароўніках і свінарніках, заходзілі ў паўнюткія свірны, пахадзілі па будучым машынным двары калгаса, дзе ўжо ўзведзены склад запасных частак і майстэрня (апошняя — у стадыі завяршэння). І ўсюды Мікалай Яўсеевіч цікавіўся літаральна ўсім, кожнай дробяззю.

У адміністрацыйным будынку ён абыйшоў усе пакоі, гутарыў з малярамі, з веданнем справы гаварыў аб іх рабоце. Калі будзе здадзены будынак? Што перашкаджае? Яго турбавала нават тое, якога колеру будуць сцены ў пакоях рэгістрацыі шлюбаў і нованароджаных. У калгаснай кацельні мой гід цікавіўся сістэмай і ёмкасцю катлоў, устройствам паддуваў і вентылятараў, саставам вогнетрывалай цэглы. У свінарніку Мікалай Яўсеевіч затрымаўся ля хлопцаў, якія варылі з жалезных трубак перагародкі («Да халадоў скончыце? А падлога? З цэглы? Кажаце, цяплей і трывалей? Яно нават і хораша — быццам паркет. А вокны прывезлі?»); у старым, але пераабсталяваным кароўніку пастаяў з мужчынамі, якія мацавалі рэйкі ваганетак («Лепш за ўсё цэментам заліць, а то дрэва перагнівае хутка»); у радзільным аддзяленні новага кароўніка пагаманіў з калгаснікам, які вывозіў ваганеткай-самаскідам гноевую жыжку («Перастала заядаць? А што — з тросам не ўсё ў парадку было?»); ля свірнаў—пагаварыў з кладаўшчыком. Кожнага з гэтых людзей ён добра ведае. Бо вось жа — пра кладаўшчыка Мікалай Яўсеевіч, калі мы адышліся ад свірнаў, казаў:

— Залуцкі, Іван Васільевіч. Цудоўны чалавек. І не толькі таму, што сумленнасці — крыштальнай. Хаця і гэта на такой рабоце шмат значыць. Галоўнае — гаспадар. Звярнулі ўвагу, якая ўсюды чысціня і парадак? Як усё дагледжана? Пажыў крышачку і ведаю: так можа рабіць чалавек, які працуе не за грошы, а за сумленне.

З сакратаром парткома калгаса я сутыкаўся, будучы ў Рачэні, не адзін раз. Аднойчы быў сведкай яго гаворкі са старшынёй калгаса Барысам Міронавічам Шапірам наконт уборкі бульбы. Што зрабіць, каб як найхутчэй выхапіць яе з зямлі? Тэхнікі — дастаткова, а вось людзей... Калгасу шмат памаглі школьнікі. Ці не змаглі б яны выйсці на поле яшчэ дзянёк-другі?

Мікалай Яўсеевіч, стукаючы ручкай па стале, задумваецца, потым уголас разважае:

— Дзень-другі, Міронавіч, можна было б выкраіць, хоць дзецям пара ўжо і вучыцца, ды і адпачыць, адагрэцца трэба было б. Але... Ну, добра, аб'явім — заўтра на бульбу, а раніцой дождж? Сарвём і заняткі, і ў поле не выйдзем... Давайце дамовімся так: загадзя аб'яўляць не будзем, хай прыходзяць у школу. А ў вас хай машыны напагатове будуць. Калі распагодзіцца, дзяцей хуценька па машынах і па хатах — пераапрануцца і на поле. Так?

У другі раз я быў сведкай яго гутаркі з выкладчыкам раённай музычнай школы. Яшчэ летась калгас набыў цэлы камплект інструментаў для духавога аркестра. Інструменты — у школе. Многія школьнікі прагнуць навучыцца іграць. А настаўніка — няма. У каторы раз дырэктар школы і старшыня калгаса ўгаворвалі гэтага музыку, каб хоць два разы на тыдзень прыязджаў у Рачэнь — не за дарма, вядома, а той упіраецца. І на гэты раз пэўнай згоды не даў, як ні ўпрошваў яго Мікалай Яўсеевіч. Пасля, калі музыка пайшоў, ён гаварыў:

— Проста бяда. Не можам даўмецца, дзе знайсці хоць бы якога спецыяліста. Вось — абяцалі 60 рублёў за чатырыпяць гадзін у тыдзень, а ён ні мычыць, не целіцца. Для яго гэта дробязь. А мог бы чалавек пакінуць пасля сябе добрую памяць... Нешта ў нас тут не дагледжана, з гэтымі музычнымі кадрамі. Не толькі ў Рачэні—амаль ва ўсіх сельскіх школах і клубах такое становішча. І, вяртаючыся зноў да таго нязгаворлівага спеца, дадаў: Адчуваю, зноў падвядзе. А так хацелася б, каб хоць адзін марш сыгралі нашы хлопцы на адкрыцці Палаца. Свята ў нас вялікае ў канцы года — 40-годдзе калгаса.

І вось у гэтым кароткім слове — «у нас» — увесь Мікалай Яўсеевіч Гарбач, чалавек, які жыве аднымі клопатамі з хлебаробамі. Настаўнік. Агітатар. Прапагандыст. Дарадчык. Партыйны сакратар.

ПРАЗ ЧАТЫРЫ ДЗЕСЯЦІГОДДЗІ

Колькі іх, у нашых вёсках, жанчын-удоў, жыццё і лёсы якіх незваротна і бязлітасна перакрэсліла вайна. Многія з іх не паспелі як след спазнаць звычайнага жаночага, а то і мацярынскага шчасця перад вайной. А хто і спазнаў, дык ненадоўга — абарвала вайна. Не мірыліся з лёсам салдаткі-ўдовы: праз гады чакалі, спадзяваліся — а можа ёсць на свеце цуды, можа нейкая іншая, меншая бяда напаткала іх чалавека? А час ішоў, і трэба было жыць, гадаваць дзяцей, карміць і апранаць не толькі іх, а многіх, ой як многіх! І ўдовы жылі, працавалі: аралі, сеялі, касілі, убіралі, малацілі. І, што грахі ўтойваць, не бачылі часта не толькі падтрымкі і дапамогі, але і звычайнай чалавечай спагады. Ды не адчайваліся, не азлабляліся на свет і людзей удовы. Праз гады нягод і нястач захавалі яны чысціню душ сваіх, умельства радавацца чужому шчасцю і спачуваць чужому гору, а яшчэ — адкрытасць і шчырасць, што было здаўна ўласціва нашым людзям. Сумленна пражыўшы гады, не навучыліся яны хаваць нешта ад людзей, ішлі да іх з адкрытымі сэрцамі — бо не было там, у гэтых сэрцах, таго, чаго можна было б сароміцца...

Не было таго, ад чаго можна было б сароміцца перад людзьмі, у жыцці старэйшай даяркі калгаса Камар Сцепаніды Лазараўны. Пра сваё жыццё яна расказвала:

— Мы тады яшчэ не тут, не ў Рачэні жылі. Сюды перабраліся пазней ужэ, перад вайной, як пасёлкі і футары ссялялі. Зімою дваццаць дзевятага калгас у нас сабраўса. Запісаласа многа, а потым, мусіць, усе і выпісаліса. Палохаць пачалі. Ууга, што гаварылі! Дык і выпісваліса. Не ўсе, праўда. Катормя камсамольцы былі, дык іх сем'і асталіса. Ну, а налета ўжэ ўсе пайшлі. Коней паздавалі, кароў пазводзілі. Але, ведама, дурныя людзі былі, не разумелі нічога. Кожны бяжыць сваю кароўку дагледзіць, падаіць. А ў даяркі ніхто не хоча ісці. Каб людзі не акрысіліся. А мой чалавек кажа: «Ідзі ты, Стэпка. Некаму ж трэба. Каровы былі свае, а цяпер — нашы, усіхнія». Ну, я й пайшла. І даіла, і карміла. Пасля і забылася ўсё, дзе там чыя карова была. А спярша ж нават і цялятак яшчэ сваімі лічылі. Тая, кажуць, цялушка ад Ганнінай Лысухі, а еты бычок — ад Дзям'янавай Красулі.

От і жыла. Потым і так у калгасе рабіла. Сюды во, у Рачэнь, перабраліса. І ўсё не паспелі зрабіць, а тут вайна. Мой чалавек з мужчынамі скаціну пагнаў. Далёка недзе былі, за Тамбовам, ці што? Казаў жа пасля, як вярнуўся, але дзе тое ўсё ў галаве ўтрымаеш... А потым з сынам на фронт пайшоў. Як пайшоў, так і не вярнуўся. Прыслалі паперку, што загінуў недзе ў Прусіі... Ну, а я, як красныя прыйшлі, зноў на ферму пайшла.

І кароў тады тых няшмат было, а як успомню, дык аж проста не верыцца. І самі галодныя былі, і каровы. А ў хлеў, бывала, не зайсці. Восенню гразь па калена, зімой — халадэча. І каровы пагорбяцца, і сама згорбішся. Пальцы так скарчэюць, як граблі.

Але ж рабілі. І гной самі выкідвалі, і бітоны цягалі, і сена. Як бы там ні было, а ўсё ж з кожным годам лепш станавілася. Каб не з сынам тое, то і зусім можна было б жыць... Бацька зусім не вярнуўся, а сын калекам прыйшоў. Без нагі. Во дасюль. А малады ж. Дваццаць гадкоў усяго. Як узяў тое да сэрца... Хлопцы і дзеўкі на вечарынку ідуць, а ён... Плакаў спачатку, а пасля піць пачаў. Колькі я ні папаўгаворвала, колькі людзі ні казалі, а от жа не слухаўся. І загубіла яго гарэлка етая...

Дачка са мною жыве. Другая тут, недалёка, на пасёлку. Дык цяпер і яна з дзецьмі ў мяне. Гэта ж горачка — пагарэла. Чалавек яе хваравіты, усё па бальніцах. Прыйшла дачка да мяне з дзецьмі — бульбу выбраць памагчы. Хату прымкнула. А там у яе трусікі. Дык суседскія хлапчукі тых трусікаў паганяць рашылі. І ці хто падвучыў, ці чулі дзе, што трусікі дыму баяцца. От і падпалілі хлеўчык. Пакуль мы дабеглі, дык усё ў агні было. Хату, праўда, удалося крыху ўратаваць. Дык от цяпер у мяне жыве...

А як цяпер робіцца? А што тут казаць — добра робіцца. І суха, і чыста. Машыны ўсё робяць. У мяне дваццаць чатыры каровы. Прыйдзеш, трубкі на цыцкі надзенеш і сочыш толькі, як малако цэдзіцца. Яно, ведома, работа ёсць работай, але ж цяпер... Мне ж шэсцьдзесят шэсць ужэ, а ўпраўляюся. І не горай, пэўна ж, за маладзейшых... Загадчыца ў нас маладая, вучоная дзяўчына, і заатэхнік, муж яе. Харошыя людзі. І павітаюцца з табой, і пагавораць, і ўсё па імю і па бацьку клічуць. І старшыня наш, Міронавіч, да мяне ўважны... Што ж яшчэ вам сказаць? Медаль палучыла. За доблесный труд. Ой, колькі я таго малака за ўсе гады надаіла! Скора ж, лічыце, сорак гадоў будзе. Каб зліў у адно месца, дык, мусіць, цэлае мора атрымалася б... Каб ета як даўней, дык дзе б там! Сілы ўжэ не тыя. А так дык і не ведаю. На пенсію ж даўно пара. А от жа ўсё цягаюса. Пайдзі на пенсію, дык і паміраць збірайса. Каб ета маладосць... Цяпер толькі і рабіць маладым на ферме. Дык не ж, усё ў горад уцякаюць...

Слухаў я Сцепаніду Лазараўну, і хацелася нізка, да зямлі, пакланіцца ёй, сціплай працаўніцы.

(Заканчэнне ў наступным нумары)

У майстэрнях мастакоў

СТВАРАЦЬ ЦУДОЎНАЕ...

З УСІМ юнай дзяўчынай прыйшла Адэлаіда Лаўрэнцьеўна Анісовіч у адзіную некалі ў рэспубліцы арцель мастацкага роспісу і вышыўкі тканін. З таго часу прайшло трыццаць гадоў...

У першыя тыдні пасля вызвалення Мінска ад фашыстаў аднаўленую арцель пашырылі і перайменавалі ў фабрыку. Адэлаіда Лаўрэнцьеўна стала яе кіраўніком.

— Спачатку мы шукалі сваіх даваенных майстрых, — успамінае Адэлаіда Лаўрэнцьеўна. — Пытым узялі некалькіх новых і пачалі працаваць — фарбаваць і вышываць тканіны.

Мала ў каго, вядома, захаваліся да гэтага часу нашы першыя пасляваенныя работы — хусткі, касынкі, шырокія, па модзе тых гадоў, гальштукі-самавязы... А шкада. Гэтыя рэчы маглі б пра многае расказаць.

У той час наша фабрыка выконвала і першыя заказы на мастацкія пано з беларускім арнаментам, на трохметровыя ручнікі, з якімі на розныя святы і ўрачыстасці ездзілі за межы рэспублікі беларускія дэлегаты. Працавалі мы дружна, памагалі адзін аднаму.

Вельмі нялёгка цяпер сабраць, прагледзець хоць бы самыя значныя работы Анісовіч. Яны захоўваюцца ў экспазіцыях многіх музеяў Беларусі, Масквы, Ленінграда.

І ўсё-такі я пабыў на своеасаблівай выстаўцы Адэлаіды Лаўрэнцьеўны. Праўда, складалася яна толькі з часткі захаваных у яе вырабаў, сувеніраў, эскізаў, альбомаў, выразак з часопісаў, якія Адэлаіда Лаўрэнцьеўна, па маёй просьбе, расклала, развесіла ў сябе ў кватэры.

І вось—першае ўражанне ад яе «хатняй выстаўкі»... Зроблена багата. І на ўсім — ад тканых гальштукаў і прыгожа аздобленых закладак да раскошных, шчодра вышытых абрусаў, ручнікоў і стылізаваных, у палосах-вясёлках, спадніц — адбітак меры і гармоніі, дзякуючы якім кожная работа выходзіць з раду звычайных. У работах выразная творчая пазіцыя мастачкі, крыніца яе натхнення — наша нацыянальная, народная творчасць, яе традыцыі, сюжэты, вобразы.

Вышыўка і ткацтва — асноўнае захапленне Адэлаіды Лаўрэнцьеўны. Але блізкія ёй і работа з дрэвам, кераміка. Напрыклад, Брэсцкая фабрыка сувеніраў ужо сёмы год выпускае невялікую драўляную ляльку па ўзоры, які прапанавала Адэлаіда Лаўрэнцьеўна. Прыгожая, у тонка выпісаным андараку, у малінавым з залатым шыццём кабатку, лялька да гэтага часу карыстаецца попытам.

Мастачка прапанавала яшчэ некалькі ўзораў лялек. Яны прыняты нашымі фабрыкамі ў вытворчасць. Адна з іх вялікая, у беларускім касцюме, зроблена як шкатулка. Другія — стылізаваныя, з павялічанай галавой, з умоўна выпісанымі тварамі. Тут жа і серыі-сем'і лялек, і сёстры «Мальвіна» і «Зося» ў яркім нацыянальным убранні. Гэтыя сёстры будуць адпраўлены на ЭКСПО-70 у Асака.

Для многіх, хто знаёмы з творчасцю Адэлаіды Лаўрэнцьеўны, прыемнай нечаканасцю былі паказаныя ёю нядаўна на выстаўцы ў Саюзе мастакоў БССР керамічныя работы — блюды, вазы, кубкі, выкананыя ў характэрных для беларускага народнага ганчарства цёмных тонах.

Гарманічна спалучаюцца форма, колер і малюнак у вазе «Зубры». Гэта параўнаўча вялікая, глыбокая чаша, на густым цёмна-зялёным фоне якой «вольна» пасуцца чорныя зубры. Нечаканым, арыгінальным упрыгожаннем выглядаюць на строгіх па форме кубках фігурныя з двума колцамі для пальцаў ручкі. На невялікім светлым блюдзе «Мінску 900» зліліся ў адным малюнку некалькі самых прыгожых будынкаў і помнікаў горада.

Хоць Адэлаіда Лаўрэнцьеўна і гаворыць, што керамікай яна занялася выпадкова, аднак у яе ёсць ужо работы, якія могуць служыць узорамі для масавай вытворчасці.

Ну, і, нарэшце, яркім, маляўнічым разводдзем разліліся перада мной шматлікія тканыя і вышываныя вырабы мастачкі—паясы і гальштукі, абрусы і пасцілкі, дарожкі і спадніцы. Вось ужо дзе багаты выбар: пад любы колер, тон, на любы густ. Спачатку нават цяжка паверыць, што сярод дзесяткаў гальштукаў і паясоў няма аднолькавых, якія б паўтараліся. Кожны гальштук і пояс—са сваім арнаментам, малюнкам, вытрыманы ў пэўнай колеравай гаме. Арнамент часцей геаметрычны—ромбы, квадраты або стылізаваныя расліны — кветкі, лісце. У ім, як у народным ткацтве і вышыўцы, пераважаюць чырвоныя, чорныя колеры, белая строчка.

На прыкладзе ўсіх гэтых работ Адэлаіды Лаўрэнцьеўны яшчэ раз бачыш, якімі невычарпальнымі для творчасці мастака могуць стаць лепшыя ўзоры народнага прыкладнога мастацтва. Па-рознаму вар'іруючы, спалучаючы квадраты, ромбы або выкарыстоўваючы цалкам якія-небудзь элементы, звенні традыцыйнага беларускага арнаменту, мастачка кожны раз знаходзіць новы, завершаны малюнак, дае арыгінальны, вытрыманы ў народным стылі ўзор.

А колер? Канечне, і тут ёсць мяжа, парушыўшы якую можна ўпасці ў крайнасць і рэч атрымаецца эклектычная. Але і ў выбары колеру эталонам для мастачкі заўсёды былі ўзоры народнай вышыўкі і ткацтва.

А тканая з ільну і шэрсці па мадэлі Анісовіч спадніца карыстаецца попытам ужо некалькі гадоў. Па нізе яе ўпрыгожваюць арнаментаваныя, ярка-зялёныя палосы, якія ўдала спалучаюцца з асноўным, шэравата-серабрыстым тонам тканіны. У цэлым рэч выглядае святочна, прыгожа. Да яе падыходзяць любая светлая вышываная кофтачка, касынка або фартух.

Знаёмячыся з узорамі вышывак Адэлаіды Лаўрэнцьеўны, няцяжка заўважыць, што перавагу яна аддае вышыўцы крыжам.

Крыжам і паўкрыжам вышыты шырокія, сакавітыя палосы, якія завяршаюць доўгія святочныя ручнікі, упрыгожваюць рукавы, манішкі сарочак, кофт, сукенак. Багатыя і разнастайныя малюнкі гэтых вышывак. У геаметрычны арнамент, складаныя завіткі, перапляценні расліннага арнаменту, часам уключаюцца стылізаваныя, сімвалічныя фігуркі птушак, людзей.

Разнастайна, смела, з улікам тону тканіны выкарыстоўвае Адэлаіда Лаўрэнцьеўна магчымасці колеру. Зялёны, блакітны, сіні, аранжавы колеры яна ўжывае разам з традыцыйнымі ў народнай беларускай вышыўцы чырвоным і чорным.

Зараз часта карыстаюцца вышыўкай у вытворчасці. Ёю аздабляюць каўнерыкі, борцікі або асобнымі, дробнымі элементамі расшываюць усё поле. Аднак і там, дзе фон запаўняецца вышыўкай густа, дзе ўжываецца яркая палітра, трэба вытрымліваць пэўны стыль, падначальваць усю разнастайнасць малюнкаў, усю гаму колеру, рытму. Гэта вельмі ўдала можа рабіць Адэлаіда Лаўрэнцьеўна і таму вышыўка яе робіць рэчы больш высакароднымі, і сапраўды мастацкімі.

Л. ПРАКОПЧЫК.

З НАВАСЕЛЛЕМ!

Наваселле заўсёды прыносіць хваляванне і радасць, прыемныя клопаты. Сёння навасёлы — студэнты аддзялення прыкладных мастацтваў Беларускага дзяржаўнага тэатральна - мастацкага інстытута.

Сярод залацістых асенніх тапаляў ускінуўся насустрач сонцу новы светлы будынак. Свежай фарбай паблісквають дзверы, з расчыненых насцеж вокнаў чуваць галасы навасёлаў. Студэнты пачалі пераносіць мэблю.

Ля ўвахода ў новы корпус мы сустрэлі аднаго з ветэранаў інстытута, загадчыка майстэрняў кафедры прыкладнога мастацтва М. Халецкага.

— Мы даўно марылі аб такім наваселлі, — усхвалявана гаворыць ён. — У старым вучэбным корпусе нам было ўжо вельмі цесна. Ні аўдыторый добрых, ні майстэрняў. Не мелі мы і добра абсталяванай выставачнай залы, дзе б нашы выхаванцы маглі дэманстраваць свае работы, наладжваць творчыя сустрэчы з калегамі з іншых вну краіны.

І мы ўжо разам прыпомнілі, як тры гады назад, на адным з факультэцкіх сходаў нарадзілася ідэя будаўніцтва новага вучэбнага корпуса. Ініцыятарамі і застрэльшчыкамі былі самі студэнты. Яны ж першымі выйшлі і на закладку падмурка. «Кожны студэнт — будаўнік!» — такі быў лозунг. І папрацаваць ім сапраўды давялося нямала. Пастараліся і будаўнікі БУ-3 будтрэста № 1 Мінпрамбуда. Хоць тэрмін здачы корпуса некалькі разоў адкладваўся, у гэтым няма іх віны. Падводзілі пастаўшчыкі будаўнічых матэрыялаў.

Разам з Мікалаем Цярэнцьевічам уваходзім у шырокія дзверы новага корпуса.

— У новым будынку,— працягвае Халецкі, — размесцяцца чатыры кафедры — прамысловай эстэтыкі, інтэр'ера і абсталявання, керамікі і тканіны. Самае галоўнае, што мы атрымалі для практычнай работы новыя, прасторныя і зручныя майстэрні. Будзе ўстаноўлена новае абсталяванне для абпалу ў керамічным аддзяленні. Задаволены студэнты, задаволены выкладчыкі. Ёсць цяпер і свая выставачная зала. Зараз у нашым распараджэнні ўвесь чацвёрты паверх агульнай плошчай 300 кв. метраў. Неўзабаве пасля наваселля мы плануем правесці серыю выставак работ нашых студэнтаў.

Мы пабывалі ў новых аўдыторыях і майстэрнях, выставачнай зале. Усе памяшканні дабротна і з густам аформлены, радуюць вока. Новая мэбля ўдала ўпісваецца ў сучасны і лёгкі інтэр'ер.

Добры падарунак атрымалі студэнты!

В. САЛАЎЕЎ.

НОВЫЯ НАЗВЫ НА АФІШАХ

Напачатку сезона акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы паказаў спектакль па драме А. Астроўскага «Апошняя ахвяра» ў пастаноўцы заслужанага дзеяча мастацтваў РСФСР Ціхана Кандрашова. Пераклад Я. Скрыгана. Мастак—Б. Герлаван. На здымку злева вы бачыце сцэну са спектакля. У ролі Юліі Паўлаўны заслужаная артыстка БССР Л. Давідовіч, Флора Фядулавіча—народны артыст СССР Л. Рахленка.

Тэатр імя Якуба Коласа ў Віцебску адкрыў свой новы сезон прэм'ерай па п'есе Льва Талстога «Улада цемры». Пастаноўшчык спектакля Барыс Эрын. Пераклад Ю. Гаўрука. Мастак — народны мастак БССР Я. Нікалаеў. На здымку справа — сцэна са спектакля: Акуліна — артыстка Г. Бальчэўская, Мікіта — артыст Л. Трушко і Анісся — заслужаная артыстка БССР Г. Маркіна.

Надрукавана ў «Полымі»

РАБОЧЫ ДЗЁННІК

Уладзімір ЮРЭВІЧ

Далягляды нашага пісьменніка шырэюць. Ён мае магчымасць ступаць далёка за межы свае краіны, каб адкрываць для сябе і для чытача невядомае і малавядомае, каб па-новаму асэнсоўваць калісьці бачанае.

І ступаюць, і адкрываюць. Праўда, ступаюць больш, чым адкрываюць. Бо не заўсёды маюць дастаткова сілы, каб прыглушыць у сабе звычайнага падарожніка-турыста, сузіральніка, не заўсёды ступаюць «на новыя землі» ў творчым настроі. Блага, калі такі сузіральнік, вярнуўшыся дамоў, спяшаецца запаланіць падвалы газет ці публіцыстычныя раздзелы часопісаў справаздачамі-скараспелкамі, дзе, звычайна, ёсць эмоцыі толькі пацверджаныя густым засевам клічнікаў, і вельмі мала думкі.

Нічога агульнага з такой павярхоўнай падарожнай літаратурай не маюць апублікаваныя ў № 8 часопіса «Полымя» дзённікі Сцяпана Александровіча. Нейтральная назва «З майго падарожжа» як бы і не абяцае нічога цікавага. Але пачынаеш чытаць, і ўжо не можна адарвацца. Вядомы як крытык і літаратуразнаўца, у меншай ступені, як празаік, С. Александровіч у цыкле «З майго падарожжа» выявіў сябе ўсхваляваным публіцыстам, г. зн. мастаком, чыё слова скіравана на фарміраванне новых поглядаў, адпаведных сучаснаму ўзроўню грамадскай свядомасці.

Сціслы запіс — факт і меркаванне, меркаванне і вывад. А за ім паўстае пэўны перыяд жыцця грамадства — мінулага ці сённяшняга, паўстае як асэнсаванне назіраных фактаў.

Едучы з Прагі ў Браціславу, аўтар знаёміцца з маладой парай. Муж-чэх вазіў жонку-славачку на паказ сваім бацькам... Чэх хваліць свае славутыя курортныя мясціны... яго гаварказая славачка не здаецца... Непрыкметна гаворка пераходзіць з бытавых тэм на праблемы нацыянальныя (у газетах вельмі многа пішацца пра будучую федэрацыю чэхаў і славакаў)... У гаворку ўключаецца маладзіца з хлопчыкам... смяецца і кажа: «У мяне даўно федэрацыя: я — чэшка, муж — славак, а вось — туліць яна да сябе хлопчыка — і чэхаславак...» Проста і па-народнаму дасціпна, мудра. З невялікай сцэнкі, заўважанай пільным вокам мастака і перададзенай з адпаведнай публіцыстычнай завостранасцю, уяўляецца амаль дакладна тая трывожная вясна 1968 года, калі хоць і цяжка, але вельмі важна было вылушчыць здаровае ядро ў шалупінні антыграмадскіх выступленняў.

Як ні апантаны быў С. Александровіч сваім асноўным творчым клопатам — дарвацца да архіваў ды бібліятэк Польшчы і Чэхаславакіі, каб «зірнуць на тыя рэдкія кнігі, што выдаваліся ў Еўропе, калі там вандраваў наш першадрукар» — ён, як публіцыст, не мог аставацца абыякавым да пэўных сацыяльных абставін, у якіх давялося яму апынуцца. Сувязь з сучаснымі радасцямі, трывогамі, клопатамі — адметная рыса дзённіка С. Александровіча. Гэта не чарнавыя накіды, а падрыхтаваны пасля ўдумлівага адбору жыццёвы матэрыял, пададзены з пэўнымі мэтамі: **адкрыць** чытачу сутнасць агульнацікавага факта, **падзяліцца** з ім думкамі, якія гэты факт выклікаў у аўтара, **пераканаць** яго ў правільнасці сваіх думак і вывадаў належнай аргументацыяй.

Які ж галоўны клопат С. Александровіча, што паклікаў яго ў далёкую дарогу?

Францішак Скарына даўно ўжо завалодаў творчай увагай беларускага даследчыка. І не ў прыклад іншым, С. Александровіч не траціць марна часу на перасейванне пылу вельмі сціплых на скарынаву спадчыну айчынных сховаў. Упарты ў сваіх дамаганнях, ён нарэшце напаў на тыя пакінутыя вялікім асветнікам сляды, што застаюцца ўсё яшчэ маладаследаванымі, або даследаваныя цікаўнымі суседзямі, яшчэ не сталі нашым паўнацэнным набыткам.

«У часе пошукаў было ўсё: і прадбачаныя і нечаканыя цяжкасці і перашкоды, былі расчараванні і неспадзяваныя находкі»,—прызнаецца С. Александровіч. І гэта не дэкларацыя, а вывад, які адзіна напрошваецца пасля прачытання яго падарожных нататак, выкананых у форме дзённіка. Рабочага дзённіка — і па форме, і па змесце. Бо на яго старонках вы не сустрэнеце аўтара, які толькі і дбае пра тое, каб быць засведчаным сваёй персонай на фоне славутых гістарычных мясцін — Вавеля і Кракава ці сабора святога Віта ў Празе. Аўтар заняты працай — зранку да позняга вечара. І вы разам з ім цяпер, чытаючы сціслыя запісы, адчуваеце асалоду гэтай працы, як бы ўключаецеся ў яе.

Ягелонская бібліятэка адкрывае перад даследчыкам тры ёмістыя тамы «Спісу навучэнцаў Кракаўскага універсітэта», складзеныя Адамам Хмелем, чыё імя нават не ўпамінаюць даследчыкі Скарыны. Значыць, С. Александровіч робіць адкрыццё, сустракаючы на пажоўклых старонках «Спісу» знаёмыя імёны тых, хто прыязджаў у Кракаў з Беларусі. Знойдзена нітачка, цягнучы за якую даследчык разматвае вялізны клубок звестак пра беларусаў, што імкнуліся да Кракава яшчэ ў той час, калі ён «славіўся ў славянскім свеце матэматычна-астранамічнай школай, ведамі, якія даваў шкалярам у галіне лацінскай класікі».

Факты, толькі факты, як і належыць для дзённіка. Вывады самыя сціслыя і першачарговыя. А факты цікавыя, змястоўныя. «Ужо ў 1428 годзе нехта Якаў з Ашмян атрымаў ступень бакалаўра. (Ці не першы гэта беларус, які атрымаў навуковую ступень?). Другі ашмянец — Мацей сын Мацея — у 1493 годзе паступіў ва універсітэт і ў надзвычай кароткі тэрмін — праз год — стаў бакалаўрам». Якія гэта каштоўныя звесткі, калі мець на ўвазе, што ў нас зусім не даследавана яшчэ гісторыя развіцця навуковай думкі ў галіне прыродазнаўства.

Знаёмячыся з гісторыяй Кракаўскага універсітэта, з яго побытам у тыя даўнія, скарынавыя часы, С. Александровіч прыходзіць да вываду: «Студэнцкі побыт быў арганізаваны так, што пражыць тут мог самы бедны шкаляр... Ёсць відавочныя факты, што сярод студэнцтва з гістарычнай Літвы былі беднякі». А мо былі сярод іх і беларускія ламаносавы, чый талент так і змарнеў, не расцвіўшы ва ўмовах суровага манастырскага рэжыму Кракаўскага універсітэта.

Аднаму даследчыку зрабіць шмат не па сіле, нават калі працаваць так, як шчыра прызнаецца С. Александровіч: «Насядзеўся ў бібліятэцы, аж радкі сталі расплывацца ў вачçу».

Напрацаваўшыся, даследчык адрываўся ад пільнага занятку ў бібліятэцы, каб прайсціся па горадзе, «бліжэй адчуць подых таго далёкага часу, калі тут, па кракаўскіх вуліцах, з шумлівай кампаніяй землякоў хадзіў шкаляр Францішак». Праўда, увага С. Александровіча больш спыняецца на помніках старажытнасці, на тым, што «выглядае неяк па-свойму экзатычна». І яно, мабыць, заканамерна для чалавека, настроенага на даўніну, на ўзнаўленне да драбніц таго, як выглядаў Кракаў у старажытныя часы.

І ўсё ж С. Александровіч жыве тым, чым жывем усе мы ў гэты знамянальны перад стагоддзем з дня нараджэння У. І. Леніна час. Цэлы раздзел у дзённіку — пра паездку ў Новы Тарг, Пароніна, Белы Дунаец. Здаецца, колькі разоў чытаў пра гэта, цешыўся хараством Татраў, засведчаным кінастужкай, а ўсё роўна, чытаючы запісы С. Александровіча, як бы яшчэ і яшчэ раз заходзіш у турэмную будыніну, дзе «пяцьдзесят пяць гадоў таму назад Ленін правёў... некалькі трывожных дзён», пераступаеш парог гуральскага дома, дзе «частым госцем быў Ільіч», адчыняеш дзверы ў «дом Тэрэзы Скупень, дзе цяпер размешчаны Ленінскі музей...».

Адчуваецца, што С. Александровіча кранула сціпласць Леніна, прастата яго побыту («Вялікі стол, засланы палатняным абрусам, доўгая драўляная лава», «...самаробная драўляная мэбля, на стале кнігі, ложак засланы коўдрай-саматканкай»), напружанасць творчага жыцця Ільіча («уставаў у сем, купаўся ў горнай рачулцы, снедаў і садзіўся за працу; пасля пехатою ішоў на пошту, абедаў і зноў падымаўся ў сваю мансарду») і багаты плён гэтай напружанасці («толькі на старонках «Праўды» ў 1913—1914 гадах Ільіч надрукаваў каля 250 артыкулаў!»). Усё гэта дэталі, якія глыбока кранулі аўтара дзённіка, імпануюць яму, настройваюць на творчы лад.

Пахадзіўшы па ленінскіх месцах, С. Александровіч як бы ўдыхнуў на поўныя грудзі гарачага паветра і зноў з яшчэ большай заўзятасцю, як сведчаць запісы, бярэцца за працу. На гэты раз у Празе, дзе Скарына выдаваў свае кнігі — першыя кнігі, пісаныя беларускай мовай. Калі ў Кракаве даследчыка цікавілі звесткі, звязаныя з навучаннем Скарыны, яго маладосцю, дык Прага спыняе ўвагу на даследаванні асаблівасцей выдання і афармлення скарынавых кніг, прафесійнага майстэрства беларускага першадрукара.

С. Александровіч зацікавіўся сувязямі скарынавых выданняў з еўрапейскімі традыцыямі, унутранай еднасцю і пераклічкай паасобных гравюр у яго кнігах. Прасочваючы па чэшскіх інкунабулах іх друкарскае афармленне, аўтар выказвае гіпотэзу, да якой варта прыслухацца: «Магчыма, на развіццё чэшскай кніжнай гравюры паўплывалі яшчэ і іншыя нейкія фактары, але нельга не бачыць залежнасці малюнкаў у кнігах севярынаў ад скарынінскіх узораў». І ў пацверджанне — спасылкі на чэшскіх даследчыкаў, якія прызнавалі перавагу мастацкага афармлення Скарынам сваіх кніг над выданнямі друкарні Севярына-Кампа.

Факты і новыя меркаванні. Імі запоўнены дзённік да краёў. Роздум уголас. Катэгарычныя вывады, але не дэкларацыі. Доказы, дапушчэнні і адкрыты для пераканаўчасці ход думкі. Адчуваецца схільнасць аўтара да жанру эсэ, што так шырока бытуе апошнім часам у друку. Узяць хоць бы раздзел пра імя Скарыны: «Увогуле, шкаляроў з імем Георгі, якія прыехалі з Беларусі і Літвы, вельмі многа... Імя Георгі мелі не толькі праваслаўныя... Калі б Скарына меў імя Георгі, то ніякай патрэбы яго мяняць на іншае не было. Значыцца, **Францішак — імя яго ўласнае, з ім ён прыехаў з дому...»**. Можа адразу і цяжка згадзіцца з такім вывадам, але падставы ўсумніцца ў сцвярджаннях тых даследчыкаў, «якія хацелі бачыць полацкага друкара абавязкова праваслаўным дзеячом» ёсць. Калі ёсць сумненні, дык ёсць і патрэба новых пошукаў. Вось чаму нельга не далучыцца да фразы-вываду С. Александровіча, што завяршае дзённік: «Патрэбны далейшыя пошукі».

Пошукі новых фактаў, што тояцца недзе ў сэрцах Варшавы, Кракава, Прагі, Браціславы... Пошукі новых гіпотэз, за якімі будуць і адкрыцці, нечаканыя па сіле доказнасці. І пошукі ўголас нават у першай сваёй стадыі, калі толькі ідзе назапашванне матэрыялу. Гэта карысна і для аўтара, і для чытача.

ЁН КЛІКАЎ ДА НОВЫХ ВЫШЫНЬ

Да 70-годдзя з дня нараджэння Адама БАБАРЭКІ

Перад намі на невялікім кавалку паперы дакумент Слабада-Кучынскага сельсавета Пукаўскай воласці Слуцкага павета са штампам, подпісамі і пячаткай, з датай «30 ліпеня 1922 года». Напісана ад рукі наступнае: «Уласнік гэтага грамадзянін в. Слабада-Кучынка Адам Антонаў Бабарэка камандзіруецца ў Беларускі Дзяржаўны Універсітэт дзеля атрымання вышэйшай асветы, каб у далейшым усе веды і сілы аддаў на дабрабыт і росквіт нашай краіны...» З гэтай камандзіроўкай Савецкай улады, выпіскай з метрычнай кнігі, пасведчаннем аб адукацыі ды заявай пераступіў 1 жніўня 1922 года парог Беларускага універсітэта і быў залічан на першы курс этнолага-лінгвістычнага аддзялення педагагічнага факультэта будучы выдатны беларускі літаратурны крытык Адам Бабарэка.



Пры паступленні ва універсітэт Бабарэку было толькі 23 гады (нарадзіўся 14 кастрычніка 1899 г.), але за плячыма меў ён цяжкі жыццёвы шлях: беззямелле, ранняя смерць бацькі, вучоба ў духоўным вучылішчы і семінарыі, праца вясковым настаўнікам, удзел у падпольнай рабоце і партызанскім руху, белапольская турма і здзекі легіянераў, праца ў валасным рэўкоме, служба ў Чырвонай Арміі. К гэтаму часу ў яго ўжо былі апублікаваныя творы (галоўным чынам, вершы).

У час вучобы літаратурна-грамадская праца Бабарэкі разгарнулася ва ўсю моц. Ужо праз год пасля паступлення на педфак, у лістападзе 1923 года, ён разам з М. Чаротам, А. Дударом, Я. Пушчам, А. Вольным і А. Александровічам заснаваў літаратурнае аб'яднанне «Маладняк». Бабарэка ўваходзіць у склад Цэнтральнага бюро «Маладняка», дзе вядзе вялікую арганізацыйную працу, прымае ўдзел у рэдагаванні часопіса «Маладняк», піша апавяданні і крытычныя артыкулы, выязджае ў мясцовыя арганізацыі літаб'яднання, дзе робіць даклады, дапамагае наладжваць літаратурныя вечары.

21 студзеня 1924 года. Цяжкая вестка абляцела краіну. Памёр Уладзімір Ільіч Ленін. Мінск у трауры. Жалобныя сходы. Адзін з такіх сходаў студэнтаў БДУ пастанавіў прасіць Наркамат асветы БССР і Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларусі прысвоіць БДУ імя Леніна.

Цэнтральнае бюро «Маладняка» звяртае ўвагу беларускіх пісьменнікаў на неабходнасць адлюстравання вобраза правадыра ў сваіх творах. 27 студзеня ў газеце «Савецкая Беларусь» з'яўляецца зварот групы маладнякоўцаў «Да ўсіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў». У ім гаварылася:

«...Мы павінны зазначыць, што мы, — дзеці рэвалюцыі, — маўчалі да гэтага часу пра бацьку і правадыра гэтай рэвалюцыі — вялікага Леніна. Як ні дзіўна, але ў нашых творах не абрысавана магутная, вялікая фігура Ільіча. А гэта ў той час, калі аб Леніне ўжо ёсць вялікая мастацкая літаратура розных песняроў на ўсіх мовах Савецкіх рэспублік. Мы гаварылі аб Кастрычніцкай рэвалюцыі і не дагаварылі. Мы не стварылі цыкла Леніна — душы вялікай Рэвалюцыі.

Ленін ад нас адышоў і мы павінны ўвекавечыць яго імя, яго жыццё, яго геніяльныя думы ў нашай літаратуры. Ён павінен жыць на Беларусі не толькі ў практычных выяўленнях творчай працы рабочага і селяніна, але яго імя павінна аддавацца вольніцка-бунтарскай музыкай на лірах нашых песняроў.

Песняры Беларусі! Няхай зазвіняць гучнаструнныя вашы гуслі ў чэсць Леніна. Укладайце ў вашыя спевы ўсё сэрца, усе пачуцці, усю сілу сваіх думак. У беларускім прыгожым пісьменстве фігура асілка Леніна павінна красавацца ва ўсёй велічы і магутнасці для нашых будучых пакаленняў.

Беларускія пісьменнікі, за працу!»

Гэты палкі зварот, у напісанні якога прымаў удзел Адам Бабарэка, сыграў сваю ролю. На старонках газет і часопісаў пачалі з'яўляцца вершы і нават паэмы, прысвечаныя Леніну. 13 красавіка 1924 года ў літаратурна-мастацкім дадатку да газеты «Савецкая Беларусь» — «Радавая руна» — з'явіўся артыкул Бабарэкі «Ленін у беларускай паэзіі», дзе Адам Антонавіч рабіў агляд мастацкіх твораў таго часу, прысвечаных У. І. Леніну. Большая частка артыкула была адведзена агляду паэмы М. Чарота «Ленін».

«Зашумелі мяцежна першыя словы з грудзей бунтарна-шумлівага Чарота, ракочучы паэму «Ленін»..., — пісаў Бабарэка. — Чарот паэмай «Ленін» разгортвае старонкі рэвалюцыйнай завірухі ад межаў семнаццатага года да дваццаць чацвёртага на вёсцы». Тут ён прыводзіць і найбольш трапныя радкі з паэмы. Далей ён разглядае вершы беларускіх паэтаў З. Бядулі, А. Александровіча, А. Вольнага, А. Дудара, Н. Чарнушэвіча і інш. У заключэнне артыкула Бабарэка пісаў аб значэнні ленінскіх матываў у беларускай паэзіі: «Перш за ўсё, па нашай думцы, гэта ў той прабоіне як з боку зместу, так і з боку формы, якую зрабіла ў беларускай паэзіі новая крыніца ленінскіх матываў, настрояў і адчуванняў. Ужо паэмаю «Ленін» Чарот расчыняе новае вакно, праз якое павінны пасачыцца з крыніцаў пралетарскага і сялянскага быту жывыя струмені тыпізацыі жыцця. Другое значэнне — у дынамічнасці вобразаў, якую выклікалі новыя крыніцы творчасці. Гэтая дынамічнасць вобразаў адкрывае перад маладняком новую пуціну мастацкай творчасці».

Сумяшчаючы вучобу з работай у літаратурнай арганізацыі, Бабарэка яшчэ і працаваў, бо трэба былі сродкі для існавання і ўтрымання старой маці. З 1922 года ён працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў мінскай сямігодцы № 11 і нейкі час нават загадвае ёю. З 1924 года Адам Антонавіч працаваў у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь».

Бабарэка быў першым беларускім крытыкам, які заўважыў паэзію Паўлюка Труса. У рэцэнзіі на першы зборнік паэта «Вершы» (1925 г.) ён пісаў: «Паўлюк Трус — гэта крыніца з беларускіх нетраў, гэта буйны вецер ад маладога жыцця... Тая народная музычнасць і тая насычанасць народнымі вобразамі, параўнаннямі, сакавітымі эпітэтамі і іншымі ўкрасамі, якія робяць верш П. Труса лёгкім, пявучым, мягкім і пяшчотным — усё гэта кажа, што паэт мае грунт для сваёй творчасці і выкіроўваецца на свой уласны творчы шлях». Адам Антонавіч даў пуцёўку ў жыццё не аднаму беларускаму пісьменніку. І нездарма яго называлі ў той час «маладнякоўскім Бялінскім».

У другой палове 1926 года Бабарэка разам з другімі пісьменнікамі прымаў удзел у стварэнні новага літаратурнага згуртавання — «Узвышша». Душой яго быў Адам Антонавіч. Ён быў і сакратаром згуртавання, і галоўным крытыкам, і рэдактарам часопіса «Узвышша», які пачаў выходзіць з 1927 года.

У 1926 годзе ён павінен быў скончыць універсітэт. К гэтаму часу Бабарэка ўжо і сам вёў курс беларускай мовы і літаратуры ў Камуністычным універсітэце журналістыкі. На педагагічным факультэце БДУ Адам Антонавіч лічыўся адным з лепшых студэнтаў. Асаблівыя поспехі ў яго былі па рускай і беларускай літаратуры.

Але напружаная літаратурная і навуковая праца і хвароба памяшалі Бабарэку своечасова закончыць універсітэт. Усяго заставалася здаць 12 залікаў, ды ў сувязі з утварэннем і наладжваннем працы новага літаратурнага згуртавання «Узвышша» прыйшлося здачу іх адлажыць на наступны год.

Дыпломнай працай А. Бабарэкі з'явілася вялікая праца аб творчасці вядомага беларускага паэта Уладзіміра Дубоўкі. Гэтая праца друкавалася асобнымі раздзеламі ў 1927—1928 гг. на старонках часопіса «Узвышша». Абараніў яе Адам Антонавіч у канцы 1928 г. Па рэкамендацыі прафесараў БДУ І. Замоціна і М. Піятуховіча Адам Антонавіч Бабарэка быў залічан на працу ва універсітэт з 1 кастрычніка 1928 г. асістэнтам кафедры гісторыі беларускай літаратуры педагагічнага факультэта.

Але, на жаль, яго жыццёвы і творчы шлях абарваўся вельмі рана — у 1930 годзе.

А. Бабарэка належаў да літаратараў эпохі Кастрычніцкай рэвалюцыі, жыццёвы і творчы шлях якіх вызначыла сацыялістычная рэвалюцыя. У 1926 годзе ў адным са сваіх артыкулаў ён пісаў: «Беларускім сялянам і рабочым патрэбна мастацтва. І гэта мастацтва павінна быць вышэйшым ад таго, якое ёсць у буржуазіі». І для ажыццяўлення гэтага Адам Бабарэка зрабіў вельмі шмат. Аб гэтым сведчаць яго шматлікія літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя творы, якія не страцілі свайго значэння і ў наш час.

М. КАМІНСКІ.

ПАЭТ-АГІТАТАР ПЕРШЫХ ПЯЦІГОДАК

Да 60-годдзя з дня нараджэння Сяргея РАКІТЫ

Творчая біяграфія ў паэта Сяргея Ракіты (Сяргея Васільевіча Законнікава) была зусім кароткай. За час свайго жыцця ён выступіў з нізкай паэтычных твораў у калектыўным зборніку «Разгон», а пасля выдаў зборнік вершаў «Я агітую за пяцігодку» (1934). Як селькор-камсамолец, ён з 1925 года змяшчаў свае нарысы і вершы ў аршанскай акруговай газеце «Камуністычны шлях» і падпісваў іх псеўданімам Сяргей Асот, а з 1929 года, калі ён быў накіраваны на працу ў гомельскую газету «Палеская праўда», змяніў свой псеўданім і ўжо вершы, рэцэнзіі, заметкі і нарысы падпісваў новым прозвішчам — Сяргей Ракіта.

У 1932—33 гадах малады пісьменнік служыў у радах Чырвонай Арміі і быў сталым карэспандэнтам вайсковай газеты «Чырвонаармейская праўда» (выдавалася на беларускай мове ў горадзе Смаленску), яго вершы і нарысы можна было сустрэць і ў рэспубліканскіх часопісах і газетах.

У 1933—36 гадах ён спачатку працуе ў рэдакцыях мінскіх газет, а пасля рэдактарам рэспубліканскіх калгасных радыёперадач. Сваю работу ён сумяшчаў з актыўнай грамадскай працай і вучобай у Камуністычным інстытуце журналістыкі.

Нарадзіўся Сяргей Законнікаў-Ракіта 15 кастрычніка 1909 года ў вёсцы Літвінава Дубровенскага раёна. Яго бацька быў даволі пісьменным на той час чалавекам; цікавіўся мастацкай і палітычнай літаратурай. За ўдзел у рэвалюцыйных сялянскіх сутычках у 1905 годзе сядзеў у турме. У часы першай імперыялістычнай вайны быў радавым на Заходнім фронце, прымаў удзел у падаўленні контррэвалюцыйных мяцяжоў у першыя дні Кастрычніка, а ў 1918 годзе, калі вярнуўся з фронту, быў абраны старшынёй камітэта беднаты ў вёсцы Літвінава.

Васіль Законнікаў аддаваў многа ўвагі выхаванню сына Сяргея, паслаў яго вучыцца ў пачатковую Літвінаўскую школу, а пасля ў сярэднюю (школа II ступені) аж за 10 кіламетраў, у вёску Новая Тухінь, хоць сям'я і мела зусім мізэрны дастатак.

Сяргей рос актыўным камсамольцам. Быў сакратаром камсамольскай ячэйкі, а з 1927 года стаў членам аршанскага акруговага камітэта ЛКСМБ. Літаратурная моладзь Беларусі таксама ведала Сяргея Ракіту як шчырага таварыша, здольнага літаратара, актыўнага грамадскага работніка.



Мне прыпамінаецца такі выпадак у Маскве. Сяргей Ракіта, Рыгор Мурашка і я вярталіся ад усесаюзнага старасты Міхаіла Іванавіча Калініна ў гасцініцу «Маяк». Было гэта ў пачатку студзеня 1931 года. Частка ўдзельнікаў дэкады беларускай культуры — пісьменнікі, журналісты, работнікі выдавецтва — сабраліся ў Міхаіла Іванавіча, каб пагаварыць аб сваёй рабоце. Нас уразіла выступленне М. І. Калініна. Ён расказаў, што рэгулярна праглядае газету «Беларуская вёска» і без перакладчыка і слоўніка чытае ў ёй важнейшыя матэрыялы.

Мы ўсю дарогу ад Крамля да гасцініцы «Маяк» толькі і гаварылі пра гэтую сустрэчу, здзіўляліся глыбокаму веданню жыцця кіраўніка дзяржавы. Сяргей Ракіта некалькі разоў паўтараў, што вось бы пісьменніку мець такія якасці.

І Сяргея Ракіту, і мяне Рыгор Мурашка запрасіў да сябе ў нумар. Гаварылі шмат і шчыра. І тады, пасля гэтай размовы, С. Ракіта прызнаўся, што тыя творы, якія ён друкуе, яго мала задавальняюць, і расказаў пра свае задумы, пра перажытае, бачанае, прапушчанае праз душу і сэрца — пра тое, што настойліва просіцца на паперу.

На жаль, ажыццявіць свае творчыя планы маладому пісьменніку так і не ўдалося. У канцы 1936 года спынілася яго творчая дзейнасць, а 23 сакавіка 1942 года пасля цяжкай хваробы пісьменніка не стала.

19 верасня 1930 года ў газеце «Чырвоная змена» С. Ракіта ад імя маладых гомельскіх літаратараў змясціў верш, у якім з уздымам гаварыў аб слаўнай будучыні Радзімы: «Энтузіязм наш не змераць барометрам плакатаў, праграм. У будучнасць шчасную вера дадзена нам».

Яго песня пра «будучнасць шчасную» была шчырай, узнёслай і пранікнёнай.

Станіслаў ШУШКЕВІЧ.



ЛЯЦІ, ПАВУЧОК

Восенню ўсім няма калі, усе кудысьці спяшаюцца, непакояцца. Дрэвы — змяніць летняе адзенне на асенняе. Птушкі — адляцець у цёплыя краіны. Трытоны, якія пражылі ўсё лета ў вадзе, чамусьці вылазяць на сушу. А жабы, наадварот, перабіраюцца бліжэй да сажалак, каб з пахаладаннем апусціцца на дно і зарыцца там у мяккі глей. У нейкім глыбокім роздуме блукаюць звяры.

Нават павучкам і тым не сядзіцца ў гэты час у родным куце. Яснымі днямі яны ткуць сабе лёгкія павуцінкі-парашуцікі і адпраўляюцца на іх у сваё далёкае падарожжа.

Але, каб павучку паспяхова зрабіць такі палёт, яму патрэбна адшукаць зручную стартавую пляцоўку. Таму восенню маленькія вандроўнікі ўпарта лезуць уверх — на высокія сцяблінкі, кусты, дрэвы. А адзін такі «лётчык» аднойчы забраўся на тэлевізійную антэну. Адтуль, з гэтакай вышыні, ён, напэўна, паляцеў далей за ўсіх сваіх суродзічаў.

А вось гэтаму «лётчыку» не пашанцавала. Для старта павучок выбраў высокі стракаты мухамор на ўзлессі. Узабраўся на чырвоную, у белыя кропелькі, шапачку грыба, ды і прыліп. Давялося браць сухую былінку і вызваляць небараку з бяды.

Ляці, павучок. Ляці ў свае нязведаныя краіны.

ЗАЛАТЫ ЛЕС

Свой зялёны летні ўбор на стракаты асенні лес змяняе непрыкметна, спакваля.

Самымі вытаччанымі модніцамі ў лесе з'яўляюцца беластволыя бярозкі, тыя самыя прыгажуні-бярозкі, якія вясной раней за іншыя дрэвы спяшаліся прыбрацца ў пышную зялёную лістоту. Пачынаецца ўсё з жоўтых стужак, якія дрэўцы сарамліва спрабуюць уплятаць у зялёныя косы яшчэ з канца жніўня. За стужкамі ідуць лёгкія жоўтыя кофтачкі, хусцінкі. А там, ужо, глядзіш, непрыкметна і ўсё дрэва ў жоўтыя строі прыбралася.

Асінкі ж гэта робяць неяк адразу. Стаіць дрэўца, стаіць доўгі час зялёным, а потым раптам у адну ноч — раз! — і пачырванела. Убачыш тады такую прыгажуню дзе-небудзь на ўзлессі, залітую асеннім сонцам, і сваім вачам не паверыш. Няўжо гэта тая самая асінка, пад якой ты не аднойчы летам з кошыкам духмяных грыбоў альбо з конаўкай ягад адпачываў, слухаючы, затаіўшы дыханне, яе таямнічы шэпт?

Цяністыя клёны пераапранаюцца па-мужчынску рашуча і хутка. А, пераапрануўшыся, тут жа спяшаюцца скінуць з сябе дарагі ўбор. Надта сціплыя — не любяць на сябе ўвагу звяртаць.

Па-сялянску сарамліва прыбіраюцца статныя ліпкі з рабінкамі. Вось так, непрыкметна, дрэва за дрэвам, глядзіш — лес і пераапрануўся ў залатую парчу.

І сапраўды: лес залаты.

Усе людзі залатому лесу радуюцца. Рад і лес людзям. Таму ён усяляк стараецца дагадзіць чалавеку — то цэлую кішэню спелых арэхаў каму насыпле, то кошык ядраных грыбоў дасць, а то і кіслымі-кіслымі журавінамі пачастуе.

ЖАЛУДЫ АСЫПАЮЦЦА

На ўзлессі стаіць дуб. Вялізны такі: бугрысты ствол у два абхваты, вышыня — шапка з галавы валіцца, у паўнеба — разлапістая рыжая крона.

Восень. Юныя дрэўцы — бярозкі, асінкі ды рабінкі, якія тоўпяцца наўкол, у стракатым убранні. У святочным уборы і дуб. Стаіць, быццам той волат у латах, і спакойна ў далячынь пазірае.

На ўзлессі няма ветру, а спелыя жалуды ападаюць. «Бум, бум, бум» — чуецца ў асенняй цішыні.

Што ў жалудах прывабнага? Ды нічога асаблівага. А вось, чамусьці, ніхто не прапусціць іх зараз без увагі.

Сарока ранкам па сваіх справах у вёску ляцела, заўважыла зверху жалуды пад дубам, апусцілася на зямлю, узяла ў дзюбу адзін пузаценькі і паляцела з ім сваёй дарогай. Стракатая сойка на нешта некалькі жоўценькіх у зялёны мох пад елачкай схавала. Лясная мыш гаркаватага ядра пакаштавала. Соладка пацёрла лапкамі вусатую мордачку і знікла ў норцы пад дрэвам.

У поўдзень вярталіся са школы хлапчукі. Збочыўшы са сцежкі, яны падышлі да дуба, напхалі поўныя кішэні каштанавых «бочачак» і таксама пайшлі. Навошта ім жалуды? Ды так — проста пазабаўляцца.

Цёмнай ноччу, калі ўсё навокал моцным сном засне, пад дуб прыйдзе табунок дзікоў. Доўга яны будуць тут спелымі жалудамі ласавацца. І толькі пад раніцу, ледзь валочачы ногі, знікнуць у яловым гушчары.

Пабудзе тут не адзін раз і праныра-вавёрка. Яна, як вядома, да жалудоў вялікая ахвотніца. Звярок бярэ ў рот жалуды і нясе іх у дупло ў старой асіне. Зімой усё спатрэбіцца. Голад — не цётка.

Будуць пад дубам, вядома, і іншыя наведвальнікі лесу.

А пакуль што сыплюцца з дрэва спелыя жалуды і сыплюцца. І што ні ўдар аб зямлю, то на зайчыны хвост карацей восень.

ВАРТАВЫ АПЕНЯК

Стаяў кастрычнік, а ў лесе зусім па-вясеннйму фіялкамі пахла.

Варушачы нагамі ў залатых бярэзніках апалую лістоту, я заўважыў перад сабой нязграбны дуб. Ён быў тоўсты, нізкі, з усохлай вершалінай. Дай, думаю, пагляджу, што гэта яму ў росце пашкодзіла.

Падыходжу бліжэй. Зірк — гнілы пень у рыжым папаратніку хаваецца. А на гэтым пні — апенькі. Ды столькі многа іх!

Я пацягнуўся рукой да грыбоў. Раптам аднекуль з папаратніку вынырнуў малюсенькі крапіўнік. Ускочыў на гнілы пень з грыбамі і давай трашчаць. Прысядае, на месцы падскоквае, рыжым хвосцікам трасе.

— Навошта табе гэтыя апенькі? — смяюся я.

— Чэ-чэ-чэ-чэ! — яшчэ мацней затрашчала птушачка, упарта не пакідаючы пня.

Нешта глуха ўпала каля маіх ног. Зірнуў угору — дзяцел, схіліўшы на бок галаву, злосна на мяне пазірае.

— Колькі вас тут, ахвотнікаў на апенькі? — дзіўлюся я. — Паспрабуй тут з вамі, назбірай грыбоў.

Я адшукаў у апалай лістоце скінутую дзятлам шышку. Яна была ўся раздзёўбана, без насення. Пакруціў яе ў руцэ і кінуў.

А крапіўнік усё трашчыць. Мне б, вядома, не цяжка было сагнаць з пня гэтую маленькую птушачку і нарэзаць салодкіх апеняк. Але я не стаў гэтага рабіць. Надта ж ужо спадабалася мне напорыстасць крапіўніка, які так смела адстойваў упадабаны куток лесу. Я адступіў назад і ціха пайшоў далей.

Доўга яшчэ ззаду чуўся ўзбуджаны крык вартавога.

ПАД ДЗІЧКАЙ

Са мной часта такое здараецца: успомніцца якое-небудзь знаёмае месца — у полі, у лесе альбо на беразе ракі, — і так раптам на яго зірнуць захочацца, што губляю над сабой усялякую ўладу і іду туды. Здавалася б, зусім якая-небудзь дробязь: крывая пачварная асінка, якая згорбленай бабулькай стаіць на лясной дарозе; чародка юных бярозак, што гулліва разбегліся па рамонкавым схіле; чорнае асенняе поле са сціртамі пацямнелай пад дажджом саломы ці яшчэ што-небудзь такое, не вартае асаблівай увагі.

Вось і ў гэты раз усплыла на памяць дзікая груша, што расла на невялічкай палянцы ў лесе. Успомнілася, і так раптам захацелася мне ў лес, што міжволі зашчымела ў грудзях.

Калі я прыйшоў на знаёмае месца, ужо было далёка за паўдня. Я сеў пад дрэва ў фіялетавай лістоце і аддаўся думкам, услухоўваючыся ў асенні лес.

Дзень стаяў ціхі, задумлівы. Адарвецца ад галінкі ліст і доўга будзе шамацець па суччах, пакуль не ляжа на прахладную асеннюю зямлю. У паветры тонка пахла духмянымі грушамі.

Але вось у гэтай напружанай цішыні пачуўся тонкі галасок:

— Ціў-ціў-ціў-ці!

Няўжо, думаю, рабчык адклікаецца?! Позна ж...

Рука міжволі пацягнулася да кішэні, дзе ў мяне заўсёды ляжыць свісцёлка — рабчыкаў прываблівань.

Свіснуў я ў яе два разы і слухаю: рабчык гэта ці не?

— Ціў-ціў-ціў-ці! — выразна данеслася з лесу.

У грудзях моцна затахкала сэрца: вядома, рабчык! Каму ж яшчэ так свістаць! Вось ужо сапраўды нечаканая радасць: не надта ўжо часта даводзіцца пасярод восені з чубатым пеўнікам паразмаўляць.

Свісне рабчык пару разоў і слухае. А я яму самачкай адказваю; маўляў, ляці сюды, я тут, пад дзічкай сяджу.

Голас пеўніка ўсё бліжэй і бліжэй.

У хуткім часе ў маладым бярэзнічку зашамацела апалая лістота. Пашамацела і — з'явіўся пяюн. Грудкі ўсе ў белых і рыжых плямках, шэрыя пёркі на галоўцы ўскудлачаны, хвост веерам, крыльцы ў чырвоным накрапе апушчаны ўніз.

Пеўнік быў так блізка ад мяне, што я баяўся вачамі міргнуць, каб не спудзіць асцярожную птушку.

Рабчык нясмела зрабіў некалькі крокаў наперад і неяк нязручна пахіснуўся.

— Эге, ды ён, аказваецца, калека, — засмуціўся я, убачыўшы, што на правай лапцы нестае пальцаў.

Восенню ўсе маладыя рабчыкі разбіваюцца на пары. Так яны, парамі, праводзяць халодную зіму. А вясной, калі прыгрэе ласкавае сонейка і згоніць у лесе снег, птушкі саўюць у аблюбаваным месцы гняздо і вывядуць птушанят.

Напэўна, гэты калека-пеўнік не адной рабушцы адклікнуўся жыццярадаснай песенькай, але... Вось ён адзінока і спявае ў прыціхлым асеннім лесе, усё спадзеючыся на нешта лепшае.

Жыццялюб!

КАСМІЧНЫЯ ПЯЦІГОДКІ

Новы эксперымент у праграме пілатуемых арбітальных палётаў з выкарыстаннем караблёў «Саюз» пачаўся ў юбілейныя для савецкай касманаўтыкі дні. Пяць гадоў назад, 12 кастрычніка 1964 года на арбіту быў выведзены першы ў свеце шматмесны пілатуемы карабель «Усход-1».

Пяць гадоў у гісторыі засваення космасу — каласальны тэрмін, на працягу яго радыкальна змянілася ўсё аблічча касманаўтыкі. Прагрэс касмічнай тэхнікі магчымы толькі ў тым выпадку, калі яго «падпірае» агульны высокі ўзровень навукова-тэхнічнага развіцця краіны. У сваю чаргу касмічная тэхніка, якая няспынна развіваецца, цягне за сабой іншыя галіны прамысловасці.

Паспрабуем прайсці «пяцігадовымі крокамі» ў гісторыю савецкай касманаўтыкі. Яна пачынаецца ў 1957 годзе.

Спачатку, пра чыста колькасныя паказчыкі. Сёлетні 1969 год яшчэ не скончыўся, а на яго рахунку ўжо прыкладна 50 запускаў спадарожнікаў, касмічных караблёў, аўтаматычных міжпланетных і месячных станцый. У 1964 годзе — 35 запускаў. А ў 1959 — усяго тры.

А цяпер пра якасны бок. Апараты, створаныя пяць або дзесяць гадоў назад зараз справядліва лічаць «мінулым векам» касмічнай тэхнікі, а ў свой час яны ж былі вялізным дасягненнем, вяршыняй інжынернай і навуковай думкі.

Ну, а сёлета? У галіне пілатуемых апаратаў узровень развіцця вызначаюць перш за ўсё караблі «Саюз». 1969 год у савецкай касманаўтыцы можна называць годам «Саюзаў», як 1964 год — годам «Усхода», а 1959 — годам аўтаматычных станцый «Месяц».

Шматмесныя камфартабельныя караблі «Саюз» спецыяльна прыстасаваны для правядзення складаных манеўраў і комплексных навукова-тэхнічных даследаванняў на арбіце. Зборка караблёў «Саюз-4» і «Саюз-5» па праву ўвайшлі ў гісторыю касманаўтыкі, як першая эксперыментальная арбітальная станцыя. У галіне месячных апаратаў узровень прагрэсу зараз характарызуюць вяртаемая станцыя «Зонд-7», якая даставіла на Зямлю вынікі навуковых даследаванняў і станцыя «Месяц-15», якая пракладала новыя шляхі даследаванняў Месяца з дапамогай непілатуемых апаратаў. У галіне міжпланетных апаратаў — аўтаматычныя станцыі «Венера-5» і «Венера-6», якія ажыццявілі непасрэдныя вымярэнні ў атмасферы Венеры. Нарэшце, у галіне спадарожнікаў Зямлі тыповымі для сёлетняга года з'яўляюцца шматлікія спадарожнікі «Космас», якія выконваюць розныя навуковыя і народнагаспадарчыя задачы.

У 1964 годзе ўзровень касмічнай тэхнікі ў галіне пілатуемых палётаў вызначаў «Усход-1». Шматмесны карабель, які забяспечваў якасна новыя магчымасці навуковых даследаванняў у космасе ў параўнанні з караблямі «Усход». Месячных станцый у 1964 годзе не запускалі. Гэта быў пераходны перыяд паміж станцыямі «першага пакалення», якія здзівілі свет у 1959, і «другога пакалення», якое ўзрушыла свет у 1966 годзе мяккай пасадкай на Месяц і даследаваннямі Месяца з селенацэнтрычнай арбіты.

У галіне міжпланетных станцый узровень тэхнікі ў 1964 годзе вызначаўся станцыямі «Зонд» «першага пакалення». Задача вяртання гэтых станцый на Зямлю яшчэ не ставілася. Аўтаматычныя спадарожнікі «узору 1964 года» — гэта першыя «Космасы», «Электроны» і манеўруючы спадарожнік «Палёт» — дзве тэндэнцыі развіцця, якія пасля зліліся і ўвасобіліся ў манеўруючых шматмесных караблях «Саюз».

І зноў пяцігадовы крок назад у «старажытную гісторыю» касмічнай эры. 1959 год. Толькі тры апараты былі запушчаны ў тым далёкім годзе. Але кожны з іх увайшоў у гісторыю. Гэта «Месяц-1» — першая штучная планета, «Месяц-2» — першы апарат, які дасягнуў іншае нябеснае цела і «Месяц-3», які ўпершыню дазволіў чалавецтву ўбачыць «нябачны» бок Месяца. Да палёту Юрыя Гагарына заставалася яшчэ два гады.

Гэты экскурс у гісторыю паказвае не толькі сам факт імклівага прагрэсу касманаўтыкі, але ў першую чаргу арганізаванасць, планамернасць, лагічную паслядоўнасць гэтага працэсу, глыбока прадуманую перспектыўнасць развіцця касмічных апаратаў. Гэтыя апараты пастаянна ўдасканальваюцца, рашаюць усё больш складаныя задачы і ўсё ў большай ступені робяцца неабходным кампанентам навуковых даследаванняў і народнай гаспадаркі, і, магчыма, самымі паказальнымі і перспектыўнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца караблі «Саюз».

Ю. МАРЫНІН,
навуковы каментатар АДН.

НАРАЧ

Музыка Кіма ЦЕСАКОВА **Словы Віктара ШЫМУКА**

Песня для высокага голасу з ф-на

Andante

Я гляджу у далеч, абдымаю даль,
Прада мною—Нарач, сіняя вада.

Не акінуць вокам возера прастор,
А за ім, далёкі, зелянее бор. 2 разы

Ля яго на ўзгорку абеліск відаць,
Пад чырвонай зоркай партызаны спяць,

Што галовы склалі за цябе, мой кут,
Каб мы век не зналі гора і пакут. 2 разы

Гойдаюцца хвалі, б'юцца ў берагі.
Мо яны спяваюць пра герояў гімн?

Я гляджу у далеч, абдымаю даль,
Нарач, цуда-Нарач, сіняя вада. 2 разы

З ДАЛЁКІХ ПАДАРОЖЖАЎ

Леў Аўэрбах

ДЗВЕ КРАІНЫ ЗА ДВА ТЫДНІ

Мы едзем у Аўстрыю і Швейцарыю. Мы — гэта група кампазітараў і музыказнаўцаў з розных куткоў Савецкага Саюза. Мэта паездкі—удзел у венскім і цюрыхскім музычных фестывалях, знаёмства з музычным жыццём гэтых краін, а таксама з памятнымі мясцінамі—іх вельмі многа ў Вене і Зальцбургу—ну, і нарэшце, «турысцкі занятак»—наведванне музеяў і карцінных галерэй, палацаў і замкаў, сабораў і могілак...

ДА ПАБАЧЭННЯ, РАДЗІМА!

У нашым невялікім калектыве — «цэнтр прыцягнення» — тры вядомыя кампазітары-песеннікі: Васілій Салаўёў-Сядой, Марк Фрадкін і Сігізмунд Кац. Іх з'яўленне на пероне брэсцкага вакзала не прайшло незаўважаным — пакуль поезд «Масква—Варшава» перастаўляўся на другія вагонныя цялежкі, пагранічнікі запрасілі кампазітараў да сябе на заставу, дзе адбыўся імправізаваны канцэрт. Байцы, свабодныя ад нясення службы на дзяржаўнай граніцы, з задавальненнем слухалі цудоўныя песні ў арыгінальным аўтарскім выкананні.

Гэта было хвалюючае развітанне з роднай зямлёй, з тымі, хто яе пільна сцеражэ, ахоўвае яе мірнае жыццё.

ВАРШАЎСКАЯ ПРЭЛЮДЫЯ

Прамы вагон «Масква—Вена» перачапляецца ў Варшаве да другога поезда, і паўтары гадзіны стаянкі на адным з варшаўскіх вакзалаў мы выкарысталі для таго, каб хоць крыху пазнаёміцца з польскай сталіцай. Варшаўскі таксіст Station Station — Станіслаў быў нядрэнным гідам і паспеў за гадзіну паказаць нам адноўленыя Старэ Място і гістарычную частку вуліцы Новы Свят, новыя набярэжныя Віслы, будынак Варшаўскай оперы, гіганцкі Палац культуры і навукі, і, канечне, Маршалкоўскую вуліцу — хіба можна быць у Варшаве і не пабываць на Маршалкоўскай? Асабліва ганарацца варшавяне — і яны маюць рацыю! — так званай Усходняй сцяной Маршалкоўскай вуліцы, гэтым сучасным архітэктурным ансамблем. На многа дзесяткаў метраў цягнецца шасціметровая шкляная сцяна трох універмагаў, а за гэтай сцяной —жылыя высотныя дамы. Гарызанталь і вертыкаль. Гэта модна— і атрымалася, сапраўды, прыгожа.

По нашай просьбе Станіслаў прывёз нас на плошчу, дзе ўзвышаецца арыгінальны помнік Фрыдэрыку Шапэну, а потым да касцёла, дзе ў адной з калон захоўваецца ў спецыяльным посудзе, за мармуровай плітою, сэрца вялікага музыканта, сэрца, якое было аддадзена Шапэнам без астатку свайму народу. Успомнілася, што ў цяжкія гады фашысцкай акупацыі патрыёты, баючыся, што ворагі будуць здзекавацца над нацыянальнай святыняй, дасталі сасуд з сэрцам Шапэна са сховішча, дзе ён знаходзіўся больш як 90 гадоў, і надзейна схавалі яго. А калі Варшава была вызвалена савецкімі і польскімі войскамі ад захопнікаў, сэрца Шапэна зноў знайшло свой вечны спакой у касцёле Святога Крыжа. Мы зайшлі ў касцёл і пакланіліся сэрцу Шапэна.

Наш цягнік пабег далей, спачатку па польскай, а потым па чэшскай зямлі. Працэдура пашпартнага кантролю вельмі кароткая. Польскія і чэшскія пагранічнікі выконваюць свой службовы абавязак з яўнай сімпатыяй да савецкіх грамадзян.

СВЯТА Ў ВЕНСКАЙ РАТУШЫ

Урачыстае адкрыццё фестывалю «Венскія святочныя тыдні» адбылося цудоўным майскім вечарам на плошчы венскай ратушы. Спецыяльна пабудаваная для гэтага свята, добра высветленая сцэна чотка вымалёўвалася на фоне зорнага неба і цёмнага фасада ратушы — натуральнай дэкарацыі, дзе не свяцілася ні адно акно. Вакол сцэны —лаўкі для гасцей (сярод запрошаных на гэтыя ганаровыя месцы былі і мы — савецкія музыканты), а за імі — уся прастора парку ратушы, дзе сабраліся тысячы венцаў.

Рытуал адкрыцця фестывалю складаўся з музычных нумароў і прамоў афіцыйных асоб. Гучаць святочныя фанфары, спецыяльна напісаныя для фестывалю кампазітарам Армінам Каўфманам, Дзяржаўны гімн Аўстрыі і... «Запрашэнне на танец» Вебера — своеасаблівае музычнае запрашэнне на фестываль. Пасля гэтага — прамова бургамістра Вены Бруна Марэка. Чардаш з аперэты Іягана Штрауса «Рыцар Пасман» (харэаграфічная інтэрпрэтацыя балета венскай оперы) — і прамова міністра адукацыі Тэадора Пiрчэвiча → Пярчэвіча. Балетная музыка з «Разамунды» Шуберта — і, нарэшце, выступленне прэзідэнта Аўстрыі Франца Іонаса, які абвясціў фестываль адкрытым.

Прэзідэнт гаварыў пра музычныя традыцыі Вены, пра мастацтва, якое збліжае людзей, садзейнічае іх дружбе.

Аб гэтай дружбе нямала гаварылася потым на прыёме, наладжаным для нас Таварыствам аўстрыйска-савецкай дружбы. Такія думкі выказваў генеральны сакратар таварыства Марцін Грунберг і падтрымаў віцэ-прэзідэнт Таварыства савецка-аўстрыйскай дружбы В. Салаўёў-Сядой. Абмен думкамі і інфармацыяй аб аўстра-савецкіх музычных сувязях быў вельмі карысны. Нам прынеслі шчырае задавальненне пахвальныя словы ў адрас дзеячоў савецкай музыкі, сказаныя аўстрыйскімі кампазітарамі Каўфманам і Рубінам.

Але вернемся ў парк ратушы. Пасля прамовы прэзідэнта венскі сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам дырыжора Макса Зайдэра і балет венскай оперы выканалі традыцыйны, самы любімы венцамі твор — вальс Іягана Штрауса «На цудоўным блакітным Дунаі». Гэты вальс даўно стаў своеасаблівым гімнам Вены.

Афіцыйная частка закончана, але канцэрт працягваецца: духавы аркестр венскіх трамвайшчыкаў выканаў інтэрнацыянальную праграму, якая складалася з музыкі Шапэна, Сметаны, Хачатурана, Іосімоты, Афенбаха і, канечне, Іягана Штрауса...

Дадамо, што такія ж канцэрты праходзілі ў многіх парках і на плошчах Вены. Тут выступалі духавыя аркестры венскіх пажарнікаў, венскіх паліцэйскіх, венскіх электрыкаў, хор і акардэонны аркестр «Рабочага пеўчага саюза», хор аб'яднання «Маладая Вена». Хацелася ўсё гэта паглядзець і паслухаць, але Вена вялікая, і мы змаглі захапіць толькі самы канец канцэрта пажарнікаў, дзе ўсё было бліскучым: і каскі, і трубы, і выкананне. Натоўп з захапленнем вітаў бравых пажарнікаў і іх абаяльнага дырыжора Тоні Датлера. Так, традыцыі венскага вулічнага музыцыравання, хоць і не зусім у тых формах, якія былі ў часы Гайдна, але працягваюцца і ў нашы дні.

ДЗЕНЬ БЕТХОВЕНА

Калі гавораць слова «Вена», яно выклікае ў кожнага музыканта асацыяцыі, звязаныя з імёнамі кампазітараў Гайдна, Моцарта, Бетховена, Шуберта, Брамса і ўсёй дынастыі Штраусаў. Тут жылі гэтыя вялікія геніі, тут былі створаны імі многія шэдэўры. Першы «рабочы дзень» фестывалю стаў для нас «днём Бетховена».

Фестываль «Венскія святочныя тыдні» быў прысвечаны тром тэмам — 100-годдзю венскай оперы, мастацтву балета і творчасці кампазітараў «новай венскай школы» (Арнольд Шонберг, Альбан Берг і Антон Веберн).

Роўна 100 гадоў назад, у маі 1869 года адбылося адкрыццё новага будынка венскай оперы, які пабудавалі архітэктары Нюль і Зікардсбург. Многія гады ён быў адным з лепшых тэатральных будынкаў свету і нейкім эталонам пышнасці і характва падобных збудаванняў. Будынак сапраўды прыгожы, манументальны, святочны. У гады другой сусветнай вайны ён моцна пацярпеў ад бамбёжак англа-амерыканскай авіяцыі. У 1955-м годзе будынак быў адноўлены, сцэна тэхнічна мадэрнізавана, а інтэр'еры некаторых фае выкананы ўжо ў сучаснай манеры.

Оперная праграма фестывалю запоўнена імёнамі Моцарта, Вагнера, Рыхарда Штрауса, Вердзі. Але першае слова было прадастаўлена Бетховену: раніцай першага дня на сцэне венскай оперы прагучаў адзін з яго капітальных твораў, які вельмі рэдка, на жаль, гучыць на нашых канцэртных эстрадах: «Урачыстая імша». Закончаная Бетховеным у 1823 годзе, яна была на наступны год выканана ў Пецярбурзе — і гэта было адзінае поўнае выкананне грандыёзнага твора пры жыцці яго стваральніка. Напісаная на традыцыйны лацінскі тэкст, «Урачыстая імша» вельмі далёка ад культавай музыкі. Ідэю гэтага твора раскрывае надпіс Бетховена на адной са старонак партытуры: «Модлы аб унутраным і знешнім міры». Пасля буры напалеонаўскіх войн, якая пранеслася па ўсёй Еўропе, мара аб міры валодала розумамі прагрэсіўных дзеячоў культуры і мастацтва. Трывогу за лёс чалавецтва, мару аб усеагульным міры і выказаў Бетховен сваім грандыёзным і натхнёным творам. Нельга не прызнаць удалай задуму арганізатараў фестывалю пачаць яго «Урачыстай імшой».

Выканалі імшу Бетховена сімфанічны аркестр венскай філармоніі і хор венскай оперы; салíравалі Гундула Яновіч, Хрыста Людвіг, Вальдэмар Кмент і Вальтэр Беры. Дырыжыраваў спецыяльна запрошаны з ЗША Леанард Бернстайн. Венскія крытыкі адзначылі яго імпульсіўную, абвостраную манеру дырыжыравання, далёкую ад нямецкай акадэмічнай школы. Скачкі Бернстайна за пультам былі ім не да спадобы. Адзін крытык назваў яго «Пятрушкай за пультам», другі адзначыў яго амерыканскі, «атамны» стыль дырыжыравання: «Бетховенскі агонь становіцца ў Бернстайна атамнай энергіяй». Але ўсе крытыкі адзначылі — і мы да іх далучаемся, — што прагучала імша цудоўна.

Пасля імшы мы адправіліся на прагулку па бетховенскай Вене. Вось плошча яго імя з помнікам вялікаму кампазітару; вось адна са шматлікіх кватэр Бетховена, але ў гэтай ён пражыў асабліва доўга, тут ён стварыў Пятую і Сёмую сімфоніі, Скрыпічны канцэрт, уверцюру «Леанора» № 3, «квартэты Разумоўскага» і многае іншае.

Цэнтральныя венскія могілкі... Гэта цэлы горад, на якім за сотні гадоў знайшлі сабе спакой больш як 6 мільёнаў чалавек. У адным з куткоў могілак знаходзяцца побач магілы Бетховена, Глюка, Шуберта, Брамса, абодвух Штраусаў — бацькі і сына, Зупе, Мілёкера. На кожнай магіле — арыгінальны помнік.

Ёсць на венскіх могілках і мемарыяльны комплекс, дзе пахаваны савецкія воіны, якія аддалі жыццё ў бітвах за вызваленне аўстрыйскага народа ад фашысцкага прыгнёту. На гэтыя святыя магілы мы ўсклалі вянкі.

Увечары — зноў венская опера, зноў Бетховен: опера «Фідэліо». Пастаноўку оперы ажыццявіў у свой час дырыжор Герберт фон Караян, якому належыць і сцэнічная кампазіцыя «Фідэліо». Але Караян, пасварыўшыся з опернай трупай, пакінуў венскую оперу, і спектаклем «Фідэліо» дырыжыраваў любімец венцаў Карл Бём, які аддаў праслаўленаму тэатру трэцюю частку свайго 75-гадовага жыцця. Пасля выканання уверцюры «Леанора» № 3 у якасці сімфанічнага антракту да апошняй карціны оперы зала грымнула бурнай авацыяй. Выкананне сапраўды было натхнёнае, аркестр чула ішоў за рукой пажылога дырыжора, акадэмічнага інтэрпрэтатара нямецкай опернай і сімфанічнай класікі.

Добрыя былі выканаўцы галоўных партый: высакародны Фларэстан, які нявінна пакутуе ў турме, — Іес Томас, яго жонка Леанора, якая пад выглядам юнака Фідэліо пранікае ў турму і выратоўвае мужа, — Леоні Рызанек-Гаўсман, турэмшчык Рока — Вальтэр Крэпель, начальнік турмы каварны Пізара, віноўнік усіх бед высакародных мужа і жонкі — Тэо Адам. Квартэт другой дзеі з удзелам гэтых персанажаў — кульмінацыйная сцэна оперы, у якой сутыкаюцца сілы дабра і зла,— зрабіла вельмі моцнае ўражанне.

У даволі традыцыйным сцэнічным афармленні оперы вылучалася дэкарацыя турмы. Мастак Гюнтэр Шнайдэр-Сіемсен паказаў не змрочныя сярэдневяковыя казематы, а нешта падобнае на канцэнтрацыйны лагер, які так знаёмы па фашысцкіх лагерах смерці. Крытыка знайшла магчымым і тут кінуць папрок Караяну, маўляў, ён «палітызаваў» оперу. Але хіба не павінен прагрэсіўны мастак даваць твору мінулай эпохі сучаснае прачытанне? Думаецца, іменна так. І невыпадкова заключная сцэна, дзе хор заклікае: «Свабоду вязням!», выклікала энтузіязм значнай часткі публікі, асабліва моладзі, якая запоўніла ўсе танныя «стаячыя» месцы. Фінальны радасны хор, які ўслаўляе пад гукі святочных фанфар перамогу справядлівасці і ўсеагульную радасць, з'явіўся выдатным завяршэннем не толькі оперы «Фідэліо», але і нашага «дня Бетховена».

Ля магілы Бетховена.

Працяг у наступным нумары.

ГОСЦІ МІНСКА

У ДУШЫ ЗАСТАЕЦЦА СВЯТЛО

...Афіша з крыху дзіўным сёння спалучэннем прозвішчаў:

— Марына Цвятаева. «Расія мая, Расія». Выканаўца — Вера Бальмонт.

Трымаю ў руках апошні зборнік паэта Льва Озерава: там, здаецца, сустракаецца гэтае імя. Так. «Артыстцы Веры Бальмонт»—адно з пасланняў паэта.

Я не чула ні блокаўскіх, ні ясенінскіх, ні іншых літаратурных вечароў Веры Дзмітрыеўны Бальмонт (яна, здаецца, дагэтуль не бывала ў Мінску). Але, калі я прачытала прысвечаныя ёй радкі, якія належалі пяру вельмі добрага савецкага паэта, то адразу даверылася яго густу, яго натхненню. Не так ужо многа мы ведаем вершаў аб чытальніках. Паэты любяць самі выконваць свае творы, ім цяжка бывае дагадзіць. Але дзеля справядлівасці трэба сказаць: не так ужо і многа артыстаў, якія могуць цалкам захапіць слухача таленавітасцю, тонкасцю трактоўкі думкі і вобразаў паэта.

...Сяджу ў актавай зале філалагічнага факультэта БДУ на вечары цвятаеўскай паэзіі. Вакол — юнакі і дзяўчаты, некаторыя з іх, магчыма, упершыню чуюць гэты пругкі, наскрозь прасякнуты паэтычным нервам, нешматслоўны верш.

З кожнай хвілінай, кожным новым радком чуецца (калі можна так сказаць) усё большае яднанне артысткі з аўдыторыяй.

На маленькай сцэне стаялі доўгія канцылярскія сталы. Спахапіўшыся, іх хацелі вынесці, але Вера Дзмітрыеўна сказала: «Не трэба. Гэта не мае ніякага значэння». Так яны і стаялі.

Гучыць верш за вершам. Ён то чуллівы і рамантычны, то эпічны, то звонкі, разудалы і шырокі, як сама Расія, то бунтарскі, прасякнуты пякучай нянавісцю да буржуазнай сутнасці (гады эміграцыі), — страсны, трагедыйны голас паэта, адарванага ад роднай, бясконца любімай зямлі. У кожным радку, у кожным слове— вялікі сум па Радзіме, па рабіне, па рускім жыце, па краіне. Цвятаева задыхаецца на чужыне, сярод «нелюдзяў» і «ваўкоў». Мы чуем пакутны крык паэта. М. Цвятаева заклікае сына:

Ни к городу и ни к селу —
Езжай, мой сын, в свою страну,—
В свой край, в свой век, в свой час...

Вера Бальмонт не пазбягае вершаў, дзе цвятаеўская паэтычная тэхніка, гукавая інструментоўка найбольш ускладнёныя. Артыстка з віртуознай лёгкасцю авалодвае своеасаблівай стылістыкай цвятаеўскага пяра. Няма, вядома, патрэбы казаць, як ёй даюцца гэтая лёгкасць і творчая свабода. Гэта— перш за ўсё талент. Талент і, вядома, нястомная натхнёная праца.

Вера Бальмонт бліскуча адчувае верш. Магчыма, штосьці дасталося ёй у спадчыну ад дзядзі — вядомага рускага паэта Канстанціна Бальмонта...

Вечар закончыўся. Пакідаючы яго, мы неслі ў душы святло паэзіі, якім шчодра адарыла нас Вера Дзмітрыеўна Бальмонт.

Б. ШАРАШЭЎСКАЯ.

АРТЫСТ ЦЫРКА— КАМПАЗІТАР

Народны артыст РСФСР Аляксандр Буслаеў — утаймавальнік звяроў. Больш як сорак гадоў свайго жыцця ён аддаў цырку. За гэтыя гады ён стварыў нямала цікавых атракцыёнаў, якія з поспехам паказваў на арэнах цыркаў Савецкага Саюза і іншых краін.

Аднак мала хто ведае Аляксандра Буслаева як кампазітара. Артыст напісаў музыку да многіх прадстаўленняў, у якіх выступаў. Пакінуўшы арэну, Буслаеў працягваў заняткі музыкай і напісаў нямала твораў розных жанраў. Сваю апошнюю работу Аляксандр Буслаеў прысвяціў калектыву двойчы ардэнаноснага завода «Рассельмаш». Музычная прэм'ера, якая адбылася нядаўна на прадпрыемстве, прайшла з поспехам.

БЕССМЯРОТНАСЦЬ У БРОНЗЕ І ГРАНІЦЕ

На п'едэстале са светлага граніту — адліты з бронзы савецкі воін. На яго абветраным у баях твары — лёгкая ўсмешка, а паднятаы ў правай руцэ аўтамат — сімвал перамогі.

Гэтай сяміметравай фігурай байца-вызваліцеля ўвенчаны манументальны помнік Савецкай Арміі ў Сафіі. Ён устаноўлены ў цэнтры сталіцы Балгарыі ў першыя гады пасля вызвалення краіны ад фашысцкага гнёту. Яго стваральнікі — балгарскія скульптары і архітэктары — у бронзе і граніце яны ўвекавечылі слаўны подзвіг савецкага народа.

Каля пяцісот помнікаў і архітэктурных збудаванняў на балгарскай зямлі — гэта і даніна прызнання рускаму народу, і высокая ацэнка подзвігу Савецкай Арміі, якая прынесла свабоду ад фашызму народам Еўропы.

Адзін з першых такіх помнікаў — храм Аляксандра Неўскага ў Сафіі. Плошча яго — больш як 2,5 тысячы квадратных метраў, а вышыня — 50 метраў. Храм узводзіўся на ахвяраванні ўсяго балгарскага народа і прысвячаўся памяці рускіх воінаў, якія загінулі за свабоду Балгарыі. Будаўніцтва храма было закончана ў 1912 годзе.

Не менш велічны комплекс помнікаў на Шыпкінскім перавале — месцы самых важных баёў у ходзе руска-турэцкай вайны 1877—1878 гадоў. Улетку 1877 года некалькі сотняў рускіх салдат і балгарскіх апалчэнцаў тут некалькі дзён стрымлівалі шматтысячную армію Сулеймана-пашы, якая спяшалася на дапамогу да асаджаных пад Плевенам турэцкіх войск. Армія Сулеймана-пашы не прарвалася на поўнач, а потым была разбіта падаспеўшымі рускімі палкамі.

Зараз цераз перавал праходзіць шырокая першакласная шаша. Пабапал дарогі, што ўецца паміж стромымі скаламі, увесь час узнікаюць велічныя помнікі. На самым высокім месцы перавала — вяршыні Сталетава — 34-метровы помнік Свабоды.

Горад Плевен, куды рвалася армія Сулеймана-пашы і дзе была ўзята пасля пяцімесячнай асады велізарная армія Асмана-пашы, — цяпер сапраўдны музей рускай баявой славы.

Шматлікія помнікі Савецкай Арміі — лагічны працяг славы народа-вызваліцеля на балгарскай зямлі. І вялікія, і малыя — яны свята ахоўваюцца братнім народам. Побач з імі — заўсёды жывыя кветкі. Сюды прыходзяць школьнікі, каб упершыню ў жыцці завязаць піянерскі гальштук, і маладыя воіны, каб даць прысягу воінскага абавязку.

Пасля Сафіі самы грандыёзны помнік нашай арміі ўзведзены ў другім па значэнні горадзе Балгарыі — Пloўдзіве → Плоўдзіве. Ён пастаўлены на самым высокім месцы — узгорку Вызваліцеляў. Воін-пераможца з шэрага граніту стаіць амаль на двухсотметровай вышыні. Ён відаць з усіх куткоў горада. Жыхары горада любоўна называюць гэту скульптуру рускім імем — Алёша.

Гэтыя шматлікія помнікі, як яркія вехі, паказваюць вялікі гістарычны шлях, якім балгарскі народ поплеч з рускім і савецкімі народамі прыйшоў да будаўніцтва шчаслівага і мірнага жыцця.

В. КУЛІКАЎ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

17 кастрычніка

Першая праграма. 9-10 — тэлебачанне — школе. Прыродазнаўства. 4-ы клас. «Масква — сталіца рускай дзяржавы». 9-40 — у свеце навукі. «Абсерваторыя сонечных зайчыкаў». Кінанарыс. 10-00 — навіны (М). 10-15 — «Маскоўская тройчы ардэнаносная». Тэлевізійны агляд, прысвечаны Маскоўскай вобласці (М). 12-00 — для школьнікаў. «Дзеці гор». Перадача з Пяцігорска. 12-30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Вясёлы гарадок» (М). 16-55 — праграма перадач. 17-00 — «Панарама навін». 17-15 — праграма, прысвечаная 25-годдзю вызвалення Украінскай ССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Перадача з Кіева. Пасля заканчэння — «Эстафета навін» (М). 22-30 — «Я — з 60-х». Маладзёжная праграма. 23-30 — навіны (М).

18 кастрычніка

Першая праграма. 8-25 — праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Дэталі машын». 9-00 — «Гімнастыка для ўсіх» (М). 9-45 — навіны (М). 10-00 — музычная вясёлая праграма (М). 10-30 — да Дня работнікаў харчовай прамысловасці. «Прыемнага апетыту!» Рэпартаж з магазіна «Сталічны» 11-00 — год ленінскай вучобы. «Камуністы Міншчыны вучацца». 11-30 — «Музычная шкатулка». 11-40 — «Тыдзень планеты». Міжнародны агляд. 12-00 — «Старонкі вашых пісьмаў». Канцэрт па заяўках. 12-40 — «Белыя і чорныя». Тэлевізійны шахматна-шашачны альманах. Тэлевізійны народны універсітэт. 13-00 — факультэт навукі і тэхнікі. «Навука і яе роля ў жыцці грамадства» (М). 13-45 — факультэт культуры. Паняцце культуры» (М). 14-30 — навіны (М). 15-00 — «Масква — Улан-Батар». Тэлевізійная пераклічка (М). 16-00 — праграма каляровага тэлебачання. 1. Для дзяцей. «Што гэта было?» Тэлеспектакль. 2. Тэлевізійны тэатр мініяцюр. «За вушка ды на сонейка». Прэм'ера тэлеспектакля. 3. «Майстры мастацтваў» Р. Ніфантава (М). 19-00 — тэлевізійны атлас народаў СССР. Татарская АССР. Перадача з Казані. 19-30 — «На агеньчык» (М). 20-45 — «Сёння — рубеж перадавікоў, заўтра — здабытак кожнага». Перадача пра саўгас «Стара-Барысаў» Барысаўскага раёна. 21-30 — «Адны непрыемнасці». Мастацкі фільм (М). 22-50 — «Вячэрні Ленінград». Эстрадная праграма. Перадача з Ленінграда. 23-30 — навіны (М).

19 кастрычніка

Першая праграма. Праграма перадач. 8-30 — для студэнтаў тэхнікумаў. «Тэарэтычная механіка». 9-00 — «На зарадку, станавіся!» (М). 9-15 — навіны (М). 9-30 — для школьнікаў. «Будзільнік» (М). 10-00 — «Музычны кіёск» (М). 10-30 — «Здароўе». Навукова-папулярная праграма (М). 11-00 — для дзяцей. Канцэрт. Перадача з Ленінграда. 11-30 — чэмпіянат СССР па спартыўнай гімнастыцы. Фінал (мужчыны). Перадача з Растова-на-Доне. 14-00 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Звязда». Тэлевізійны часопіс. 15.00 — «Тэлевізійны каляндар». «Сёння — Дзень работнікаў харчовай прамысловасці (М). 15-30 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Зброяй кіно». Пра IV міжнародны кінафестываль ваенных фільмаў у Бухарэсце (М). 16-00 — «Сельская гадзіна» (М). 17-00 — чэмпіянат СССР па спартыўнай гімнастыцы. Фінал (жанчыны) Перадача з Растова-на-Доне. 19-00 — праграма каляровага тэлебачання. «Клуб кінападарожнікаў» (М). 20-00 — у эфіры — «Маладосць». «Аўкцыён». Турызм (М). 21-15 — «Сем дзён». Міжнародная праграма (М). 22-00 — «Будучае Заслаўскага вадасховішча». Пра новую зону адпачынку мінчан. 22-30 — «Грэнада, Грэнада, Грэнада мая». Дакументальны фільм. 23-40 — «Спартыўны тыдзень» (М). 23-55 — навіны (М).

ВЯЛІКІ ПОСПЕХ ТЫДНЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

З вялікім поспехам праходзіць у Фінляндыі тыдзень культуры Беларусі. Шмат наведвальнікаў на выстаўках, перапоўнены канцэртныя залы ў час выступленняў беларускіх артыстаў. Вялікую цікавасць праяўляюць фіны да лекцый і дакладаў беларускіх вучоных, урачоў і педагогаў. У клубе кааператыву горада Пяксемякі з лекцыяй аб ролі савецкіх прафсаюзаў у камуністычным будаўніцтве выступіў сакратар Мінскага абласнога савета прафсаюзаў Л. Н. Пракапенка, Е. М. Сельдзімірава зрабіла даклад на тэму «Арганізацыя аховы здароўя ў БССР». Аб дасягненнях Савецкай Беларусі за гады Савецкай улады і ролі Камуністычнай партыі расказала шматлікай аўдыторыі Т. М. Якута.

Учора ва універсітэце горада Ювяскюля з лекцыяй «Ленін аб імперыялізме» выступіў Р. А. Ткачук.

Дэлегацыя Беларускай ССР на чале з намеснікам Старшыні Савета Міністраў рэспублікі Р. Я. Кісялёвым, якая знаходзіцца ў Ювяскюлі, знаёмілася ўчора з прадпрыемствамі ў Ваякоскі. Кіраўнік дэлегацыі Р. Я. Кісялёў адправіўся затым у Хельсінкі, дзе ён прыме ўдзел ва ўрачыстым пасяджэнні праўлення таварыства «Фінляндыя — Савецкі Саюз» у сувязі з 25-годдзем таварыства.

ТАСС.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. АТ 17740.